ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР

№ 33 (583) | Субота, 28 верасня 1946 года. | Цана 50 кап.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
аб X Пленуме ЦК КП(б) Беларусі

23—24 верасня 1946 года адбыўся чарговы X Пленум ЦК КП(б) Беларусі. Пленум заслухаў і абмеркаваў наступныя пытанні:

1. Пастанову ЦК ВКП(б) ад 26 ліпеня 1946 года «Аб росце партыі і аб мерах па ўзмацненню партыйна-арганізацыйнай і партыйна-палітычнай работы з уноў паступіўшымі ў ВКП(б)».

2. Аб мерапрыемствах па выкананню пастановы Совета Міністраў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) ад 19 верасня 1946 г. «Аб мерах па ліквідацыі парушэнняў Статута сельскагаспадарчай арцелі ў калгасах».

У рабоце Пленума прынялі ўдзел першыя сакратары абкомаў КП(б) Беларусі.

Па першаму пытанню — Пастанова ЦК ВКП(б) ад 26 ліпеня 1946 года «Аб росце партыі і аб мерах па ўзмацненню партыйна-арганізацыйнай і партыйна-палітычнай работы з уноў уступіўшымі ў ВКП(б)», з дакладам выступіў сакратар ЦК КП(б) Беларусі тав. Кісялёў Н. В.

У спрэчках выступілі т. т. Дзянісевіч Ф. Я. (сакратар Баранавіцкага гаркома КП(б)Б), Пазднякоў І. В. (сакратар Аршанскага гаркома КП(б)Б), Аўхімовіч Н. Е. (сакратар ЦК КП(б)Б), Сядых В. Я. (старшыня Рэвізійнай камісіі КП(б)Б), Эльман А. П. (сакратар Гродненскага абкома КП(б)Б), Мельнікаў Н. П. (сакратар Калінкавіцкага райкома КП(б)Б), Бударын К. І. (начальнік Кіраўніцтва па транспартнаму асваенню малых рэк пры Совеце Міністраў БССР), Бугаёў Е. І. (нам. заг. аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б), Кляшчоў А. Е. (сакратар Полацкага абкома КП(б)Б), Крылоў Л. І. (упаўнаважаны КПК пры ЦК ВКП(б) па БССР), Мазураў К. Т. (сакратар ЦК ЛКСМБ), Дзедаў А. Л. (сакратар Мінскага абкома КП(б)Б), Карасёў І. Н. (сакратар Палескага абкома КП(б)Б), Папоў Ф. О. (заг. партархіва ЦК КП(б)Б), Пратазанаў А. К. (нам. заг. аргінструктарскага аддзела ЦК КП(б)Б), Казбінцаў (начальнік палітКіраўніцтва Беларускай Ваеннай Акругі), Федасюк А. І. (заг. аддзела па рабоце сярод жанчын ЦК КП(б)Б), Мурэін М. С. (нам. начальніка Заходняй акругі чыгунак).

На Пленуме з прамовай па першаму і другому пытаннях выступіў сакратар ЦК КП(б) Беларусі тав. Панамарэнка П. К.

Па пытаннях, якія былі заслуханы, Пленум ЦК КП(б) Беларусі прыняў разгорнутыя рашэнні.

(БЕЛТА).

Пачэсныя задачы

У мінулым нумары нашай газеты быў надрукаваны прыняты Вярхоўным Советам БССР Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1946—1950 г. г. Сёння мы друкуем даклад таварыша Жданава аб часопісах «Звезда» і «Ленинград». Абодвы гэтыя дакументы маюць вялікае значэнне для далейшага росту, удасканалення і развіцця беларускай совецкай літаратуры, беларускага выяўленчага, музычнага і тэатральнага мастацтва. Сапраўды, якая велічная перспектыва далейшага соцыялістычнага будаўніцтва вызначана ў новым пяцігадовым плане БССР—сустаўной частцы пяцігадовага плана Саюза ССР. На працягу 1946—1950 г. г. капіталаўкладанні па нашай рэспубліцы вызначаны ў памеры 6.950 мільёнаў рублёў, што перавышае капіталаўкладанні трох перадваенных пяцігодак, узятых разам. Такога гіганцкага росту будаўніцтва мы яшчэ не мелі за ўсю сваю папярэднюю гісторыю. Перад беларускімі совецкімі пісьменнікамі і дзеячамі ўсіх галін мастацтва адкрываюцца неабмежаваныя творчыя перспектывы, перадімі ўзнікае многа новых аб'ектаў, на якіх яны могуць і павінны сканцэнтраваць сваю творчую ўвагу. Разам з тым, як ніколі раней, пісьменнікі і дзеячы мастацтва закліканы вырашыць рад складаных пытанняў па ўдасканаленню свайго майстэрства, па ідэйнаму паглыбленню сваёй творчасці, бо «наша літаратура, якая адлюстроўвае лад больш высокі, чым усялякі буржуазна-дэмакратычны лад, культуру, на многа разоў больш высокую, чым буржуазная культура, мае права на тое, каб вучыць другіх новай агульначалавечай маралі. Дзе вы знойдзеце такі народ і такую краіну, як у нас? Дзе вы знойдзеце такія выдатныя якасці людзей, якія праявіў наш совецкі народ у Вялікай Айчыннай вайне і якія ён кожны дзень праяўляе ў працоўных справах, перайшоўшы да мірнага развіцця і аднаўлення гаспадаркі і культуры! Кожны дзень узнімае наш народ усё вышэй і вышэй. Мы сёння не тыя, што былі ўчора, і заўтра будзем не тымі, што былі сёння. Мы ўжо не тыя рускіх, якімі былі да 1917 года, і Русь у нас ужо не тая, і характар у нас не той. Мы змяніліся і выраслі разам з тымі найвялікшымі пераўтварэннямі, якія ў корані змянілі аблічча нашай краіны» (Жданаў).

Справай чэсці і грамадзянскім абавязкам для кожнага работніка літаратуры і мастацтва з'яўляецца актыўны ўдзел ва ўсенародным змаганні за ажыццяўленне новай Сталінскай пяцігодкі.

«Вялікая энергія, — вучыць нас таварыш Сталін,—нараджаецца толькі для вялікай мэты». Раскрыць і паказаць сродкамі мастацтва вялікую мэту пяцігодкі ва ўсёй яе велічы і грандыёзнасці—першая і важнейшая задача пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў. Удзел ва ўсенародным змаганні за ажыццяўленне пяцігадовага плана таксама павінен заключацца ў стварэнні такіх ідэйна насычаных, сапраўды мастацкіх твораў, якія-б дапамагалі совецкім людзям правільна зразумець і вырашыць вострыя, надзённыя праблемы ўладкавання свайго пасляваеннага жыцця, твораў, якія-б паказвалі жыццё совецкага грамадства ў яго няспынным руху наперад, былі-б заўсёды накіраваны ў будучае і гартавалі ў совецкіх людзях, і асабліва моладзі, непахісную ўпэўненасць у перамогу нашай справы. Гэтыя творы павінны раскрыць сутнасць маральнага подзвіга совецкага чалавека на франтах Айчыннай вайны і на фронце мірнай стваральнай працы, і ўсяляк спрыяць развіццю лепшых бакоў яго характара, выхоўваючы совецкага чалавека ў духу беззаветнай адданасці комуністычнай партыі і Совецкай Радзіме, чалавека, здольнага не баяцца цяжкасцей і ўмець пераадольваць іх, абуджаючы ў ім прагу ўдзельнічаць у сённешнім і прадстаячым змаганні за комунізм.

Адсюль вынікае неадкладная патрэба пашырыць тэматыку мастацкіх твораў, бо беларуская літаратура і мастацтва пакуль застаюцца ў даўгу перад працоўнымі нашай рэспублікі — творцамі яе індустрыяльнага прагрэса, перад дзеячамі навукі і культуры, перад новым, узбагачаным вопытам вайны чалавекам-сучаснікам. Узнікае надзённая патрэба аднавіць у правах чамусьці занядбаныя ў апошні час аператыўныя па сваёму характару малыя формы, і побач з манументальнымі творамі, ствараць вершы-заклікі, невялікія апавяданні, нарысы, адпаведныя п'есы, песні, плакаты, якія адыгралі надзвычай карысную ролю ў гады папярэдніх пяцігодак. Патрэбна пераадолець сілу інерцыі, адмовіцца ад застарэлага літаратурнага і мастацкага рэквізіта, што зрабіўся штампам, вынайсці і адкрыць новыя, сучасныя часу выяўленчыя сродкі і вобразы.

Стаць на ўзроўні сучасных ведаў і задач, сістэматычна і глыбока вывучаць жыццё, няўхільна кіравацца ў сваёй рабоце палітыкай совецкай дзяржавы—асновай совецкага ладу, прапагандаваць у сваіх творах гэту палітыку—справа чэсці і грамадзянскі абавязак кожнага пісьменніка, артыста, мастака і кампазітара.

Пачэсную ролю ва ўсім гэтым павінна адыграць наша крытыка, якая канчаткова і рашуча павінна вызваліцца ад усялякага ўгодніцтва і імкнення прыстасавацца да групавых і вузка-ведамственых інтарэсаў. У артыкулах і работах некаторых крытыкаў, мастацтвазнаўцаў і літаратуразнаўцаў, апрача гэтага часам маюць месца нацыяналістычныя тэндэнцыі. Развіццё беларускай літаратуры і мастацтва разглядаецца імі ў адрыве ад развіцця рускай літаратуры і мастацтва.

Пісьменнікі і мастакі мінулага, у тым ліку нават нязначныя, ацэньваюцца як выдатныя і залічваюцца ў класікі, а памерхоўна - ліберальныя прадстаўляюцца як наследоўныя дэмакраты - рэволюцыянеры. У праекце праграмы па гісторыі беларускай літаратуры для ВНІІСТЫТУТАЎ, укладзенай М. Ларчанкам, сустракаюцца такія памылковыя сцверджанні, накшталт—«Уваход Беларусі ў склад Расійскай імперыі—меншае зло (?!) у параўнанні з тым становішчам, якое яна займала ў складзе Жэчы Паспалітай». Літаратурнае аб'яднанне «Узвышша» тут ставіцца побач з «Маладняком» і «Полымем» і не даецца сапраўдны аналіз платформы гэтых аб'яднанняў і г. д. Па гэтаму «праекту» выкладанне гісторыі беларускай літаратуры вялося ў мінулым навучальным годзе і фактычна вядзецца цяпер

У святле задач пяцігадовага плана аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР асабліва значэнне набывае таксама прапаганда літаратуры і мастацтва сярод шырокіх мас працоўных. Масавыя і шматтыражныя выданні лепшых твораў беларускіх пісьменнікаў і кампазітараў, шырокая пропагандыя лепшых здабыткаў музычнага, тэатральнага і выяўленчага мастацтва праз лекцыі, даклады, выстаўкі, канцэрты ў сталіцы і на перыферыі, на прадпрыемствах і ў калгасах, выступленне саміх майстроў перад рабочымі, калгаснікамі і інтэлігенцыяй рэспублікі—робяцца надзвычай неабходнымі.

Няўхільна кіруючыся апошнімі пастановамі ЦК ВКП(б) — «Аб часопісах «Звезда» і «Ленинград», «Аб рэпертуары драматычных тэатраў і мерах па яго паляпшэнню» і «Аб кіно-фільме «Большая жизнь», а таксама дакладам тав. Жданава аб часопісах «Звезда» і «Ленинград»—работнікі беларускай літаратуры і мастацтва з гонарам выканаюць пастаўленыя перад імі задачы і створаць поўнацэнныя высокаідэйныя творы, вартыя Вялікай Сталінскай эпохі.

АДКАЗЫ тав. І. В. СТАЛІНА
на пытанні, заданыя маскоўскім карэспандэнтам „Сандэй Таймс" панам Аляксандрам Верт у сваёй запісцы на імя т. Сталіна ад 17 верасня 1946 г.

Пытанне. Ці верыце Вы ў рэальную небяспеку «новай вайны», аб якой у сучасны момант вядзецца так многа безадказных размоў ва ўсім свеце? Якія крокі павінны-б быць прадпрыняты для прадухілення вайны, калі такая небяспека існуе?

Адказ. Я не веру ў рэальную небяспеку «новай вайны».

Аб «новай вайне» шумяць цяпер галоўным чынам ваенна-палітычныя разведчыкі і іх нешматлікія прыхільнікі з радоў грамадзянскіх чыноў. Ім патрэбен гэты шум хоць-бы для таго, каб: а) запалохаць зданню вайны некаторых наіўных палітыкаў з радоў сваіх контрагентаў і дапамагчы такім чынам сваім урадам вырваць у контрагентаў пабольш уступак; б) затрудніць на некаторы час скарачэнне ваенных бюджэтаў у сваіх краінах; в) затармазіць дэмабілізацыю войск і прадухіліць такім чынам хуткі рост беспрацоўя ў сваіх краінах.

Трэба строга адрозніваць паміж шуміхай аб «новай вайне», якая вядзецца цяпер, і рэальнай небяспекай «новай вайны», якой не існуе ў сучасны момант.

Пытанне. Ці лічыце Вы, што Вялікабрытанія і Злучаныя Штаты Амерыкі свядома ствараюць для Совецкага Саюза «капіталістычнае абкружэнне»?

Адказ. Я не думаю, каб кіруючыя колы Вялікабрытаніі і Злучаных Штатаў Амерыкі маглі стварыць «капіталістычнае абкружэнне» «для Совецкага Саюза», калі-б нават яны хацелі гэтага, чаго я аднак не магу сцвярджаць.

Пытанне. Гаворачы словамі пана Уолеса ў яго апошняй прамове, ці могуць Англія, Заходняя Еўропа і Злучаныя Штаты быць упэўнены, што совецкая палітыка ў Германіі не ператворыцца ў зброю рускіх імкненняў, накіраваных супроць Заходняй Еўропы?

Адказ. Я лічу выключаным скарыстанне Германіі Совецкім Саюзам супроць Заходняй Еўропы і Злучаных Штатаў Амерыкі. Я лічу гэта выключаным не толькі таму, што Совецкі Саюз звязаны дагаворам аб узаемнай дапамозе супроць германскай агрэсіі з Вялікабрытаніяй і Францыяй, а са Злучанымі Штатамі Амерыкі—рашэннямі Патсдамскай Канферэнцыі трох вялікіх дзяржаў, але і таму, што палітыка скарыстання Германіі супроць Заходняй Еўропы і Злучаных Штатаў Амерыкі азначала-б адыход Совецкага Саюза ад яго карэнных нацыянальных інтарэсаў.

Гаворачы коратка, палітыка Совецкага Саюза ў германскім пытанні зводзіцца да дэмілітарызацыі і дэмакратызацыі Германіі. Я думаю, што дэмілітарызацыя і дэмакратызацыя Германіі ўяўляюць адну з самых важных гарантый устанаўлення трывалага і працяглага міру.

Пытанне. Якая Ваша думка наконт абвінавачанняў у тым, што палітыка комуністычных партый Заходняй Еўропы «дыктуецца Масквой»?

Адказ. Гэтае абвінавачанне я лічу бязглуздым, запазычаным з абанкроціўшагося арсенала Гітлера — Гебельса.

Пытанне. Ці верыце Вы ў магчымасць прыяцельскага і працяглага супрацоўніцтва Совецкага Саюза і заходніх дэмакратый, не гледзячы на існаванне ідэалагічных рознагалоссяў, і ў «прыяцельскае спаборніцтва» паміж двума сістэмамі, аб якім гаварыў у сваёй прамове Уолес?

Адказ. Безумоўна веру.

Пытанне. У часе прабывання тут дэлегацыі лейбарыстцкай партыі Вы, наколькі я зразумеў, выказалі ўпэўненасць у магчымасці прыязных адносін паміж Совецкім Саюзам і Вялікабрытаніяй. Што дапамагло-б устанаўленню гэтых адносін, якіх так горача жадаюць шырокія масы англійскага народа?

Адказ. Я сапраўды ўпэўнены ў магчымасці прыязных адносін паміж Совецкім Саюзам і Вялікабрытаніяй. Устанаўленню такіх адносін значна садзейнічала-б узмацненне палітычных, гандлёвых і культурных сувязей паміж гэтымі краінамі.

Пытанне. Ці лічыце Вы хутчэйшы адвод усіх амерыканскіх войск з Кітая жыццёва неабходным для будучага міру?

Адказ. Так, лічу.

Пытанне. Ці лічыце Вы, што фактычна манапольнае валоданне ЗША атамнай бомбай з'яўляецца адной з галоўных пагроз міру?

Адказ. Я не лічу атамную бомбу такой сур'ёзнай сілай, якой схільны яе лічыць некаторыя палітычныя дзеячы. Атамныя бомбы прызначаны для застрашэння слабанервовых, але яны не могуць вырашаць лёс вайны, бо для гэтага зусім недастаткова атамных бомб. Вядома, манапольнае валоданне сакрэтам атамнай бомбы стварае пагрозу, але супроць гэтага існуюць, па крайняй меры, два сродкі: а) манапольнае валоданне атамнай бомбай не можа прадаўжацца доўга; б) ужыванне атамнай бомбы будзе забаронена.

Пытанне. Ці думаеце Вы, што з далейшым рухам Совецкага Саюза да комунізма магчымасці мірнага супрацоўніцтва са знешнім светам не зменшацца, паколькі гэта датычыць Совецкага Саюза? Ці магчым «комунізм у адной краіне»?

Адказ. Я не сумняваюся, што магчымасці мірнага супрацоўніцтва не толькі не зменшацца, а могуць нават павялічыцца.

«Комунізм у адной краіне» зусім магчым, асабліва ў такой краіне, як Совецкі Саюз.

СПРАВА ЧЭСЦІ ПІСЬМЕННІКА

Совецкі народ, які здзівіў увесь свет бясспрыкладнай у гісторыі чалавецтва гераічнай барацьбой у часы Вялікай Айчыннай вайны, цяпер разгарнуў сваё вялікае наступленне на фронце мірнага соцыялістычнага будаўніцтва. Сталінскім геніем асветлены шлях далейшага руху совецкага народа да комунізма.

Зацверджаны VIII Сесіяй Вярхоўнага Совета БССР пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларусі з'яўляецца неадлучнай часткай пяцігодкі аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі ўсяго Совецкага Саюза. Ён яскрава сведчыць пра клопаты большэвіцкай партыі і яе вялікага правадыра таварыша Сталіна аб Совецкай Беларусі і беларускім народзе. За пяць год Совецкай Беларусі трэба прайсці такі шлях, які яна прайшла на працягу трох даваенных пяцігодак.

Барацьба за выкананне і перавыкананне пяцігадовага плана ёсць барацьба за тое, каб яшчэ лепш і больш культурна жылі нашы людзі, каб наша Радзіма была яшчэ больш моцнай і багатай.

Надзвычай адказныя задачы стаяць перад совецкімі пісьменнікамі. Пісьменнік—слуга народа, інжынер чалавечых душ. Месца пісьменніка ў барацьбе за ажыццяўленне грандыёзных задач будаўніцтва, за перамогу комунізма надзвычай пачэснае. Пісьменнік павінен непарыўна быць звязаны з народам, толькі тады ён зможа праўдзіва і глыбока адлюстраваць тое, што адбываецца ў нашым соцыялістычным грамадстве, дапаможа чытачу зазірнуць у будучыню.

Совецкі грамадскі лад ператварыў працу ў справу чэсці і славы, у справу доблесці і геройства; кожнага радавога працаўніка ён зрабіў удзельнікам усенароднай, агульнадзяржаўнай справы. Задача пісьменніка паказаць ва ўсёй велічы перадавога совецкага чалавека, паказаць, што на якім-бы ўчастку ён ні працаваў, якой-бы сціплай ні была яго праца, совецкі чалавек—герой і творца новага жыцця, ён—будаўнік сваёй дзяржавы, ён—змагар за пабудову комуністычнага грамадства ў нашай краіне. Сваім мастацкім словам пісьменнік павінен выхоўваць комуністычную свядомасць у працоўных, змагацца за ліквідацыю перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей. А таму кожны пісьменнік перш за ўсё павінен быць сам на ўзроўні перадавых людзей нашага часу, ён павінен пястомна з дня на дзень авалодваць марксісцка-ленінскай тэорыяй.

У святле агульных задач, якія стаяць перад намі, мне хочацца сказаць некалькі слоў аб найбольш занядбаным жанры нашай беларускай літаратуры — аб прозе. Я лічу памылковым погляд некаторых нашых літаратараў, якія даводзяць, што адсутнасць у беларускай літаратуры пасляваеннага часу новых буйных празаічных твораў тлумачыцца тым, што нібыта ў нас невялікая колькасць празаікаў. Я лічу, што гэта думка памылковая. Яна прыкрывае сабой залішнюю заспакоенасць, бестурботнае спачуванне, не мабілізуе празаікаў, не актывізуе іх творчыя магчымасці.

На самай-жа справе колькасць літаратараў, якія працуюць у галіне прозы, не так ужо і малая. Побач з вядомымі нашымі празаікамі Міхасём Лыньковым і Янкам Маўрам у нас працуюць у галіне прозы такія пісьменнікі, як Усевалад Краўчанка, Макар Паслядовіч, Ілья Гурскі, Алесь Якімовіч, Павел Кавалёў, Мікола Лупсякоў. Выступілі з першымі сваімі творамі ў прозе Міхась Клімковіч, Піліп Пестрак і Янка Шарахоўскі.

Чым-жа тлумачыцца, што наша беларуская проза адстае ад жыцця, што за ўвесь пасляваенны час на тэму аднаўлення з'явілася толькі адна невялікая аповесць Усевалада Краўчанкі «Станаўленне», ды некалькі дробных апавяданняў, дарэчы, пераважна нізкай якасці? Мне здаецца, што асноўнай прычынай, па-першае, з'яўляецца тое, што нашы празаікі адарваны ад надзённага жыцця рабочых і калгаснікаў нашай краіны, і таму ім цяжка праўдзіва і глыбока пісаць на сучасныя тэмы. Па-другое, што Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў недаацаніла важнасці працы з маладымі пісьменнікамі; яно на працягу двух апошніх год ні разу не сабрала іх, не ставіла перад імі ні аднаго творчага пытання. Таму зусім не выпадкова, што на старонкі нашага друку траплялі творы безыдэйныя, у літаратурных адносінах бездапаможныя і нават часам такія творы, якія скажалі нашу рэчаіснасць. Па-трэцяе, беспрынцыповая, угодніцкая крытыка ў значнай меры дэзарыентавала маладыя кадры празаікаў.

Усё гэта патрабуе неадкладнай і карэннай перабудовы дзейнасці нашай пісьменніцкай арганізацыі ў адпаведнасці з апошнімі пастановамі ЦК ВКП(б). У нас ёсць усе дадзеныя, каб узняць нашу прозу на ўзровень тых запатрабаванняў, якіх патрабуе ад нас наша партыя, наш народ.

Няма ніякага сумнення ў тым, што, кіруючыся ўказаннямі нашай партыі, разгортваючы большэвіцкую крытыку ў літаратурнай арганізацыі, празаікі прыкладуць усе свае сілы, увесь свой талент на стварэнне высокаякасных мастацкіх твораў і тым самым унясуць свой уклад у справу паспяховай барацьбы за выкананне пяцігадовага плана, за перамогу комунізма ў нашай краіне.

Што датычыцца асабістага творчага плана, то я буду працягваць сваю працу над раманам «Пад мірным небам», з тым, каб у пачатку 1947 года закончыць першую кнігу, а да канца пяцігодкі напісаць другую кнігу гэтага рамана.

А. СТАХОВІЧ.

Стварыць поўнацэнныя вобразы совецкіх людзей

Пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР выклікаў у мяне вялікае захапленне сваім шырокім размахам. Ён абудзіў таксама пачуццё гонару за нашу Радзіму, таму што толькі магутная соцыялістычная дзяржава можа ўкласці такую грандыёзную праграму дзейнасці, якая прывядзе да небывалага росквіту нашай совецкай рэспублікі.

Хочацца прыкласці ўсе свае сілы, каб дапамагчы паспяховаму выкананню вялікага пяцігадовага плана. Работнікі мастацтва могуць адыграць у гэтай справе вялікую ролю, натхняючы працоўныя масы на пачэсную стваральную працу.

Мы павінны патрабаваць ад драматургаў такіх п'ес, дзе-б дзейнічалі моцныя совецкія людзі, глыбока адданыя справе комунізма, валявыя і мэтаімклівыя. Мы павінны змагацца за тое, каб спектаклі, створаныя намі, былі глыбока-ідэйныя і высокай мастацкай якасці.

Вельмі хочацца ствараць вобразы такіх людзей, якія былі-б узорам для нашай моладзі, увасаблялі-б лепшыя якасці совецкага чалавека і ўзмацнялі-б бадзёрасць і веру ў нашую цудоўную будучыню.

Народная артыстка БССР
В. ГАЛІНА.

Уславім велічную Сталінскую эпоху

Прыняты VIII сесіяй Вярхоўнага Совета БССР пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі і культуры Беларускай ССР ускладае і на работнікаў мастацтва ганаровую і адказную задачу.

Разбураныя нямецка-фашысцкімі вандаламі беларускія гарады павінны быць адноўлены і сярод іх у першую чаргу—наша сталіца г. Мінск. Ён павінен стаць адным з прыгажэйшых гарадоў СССР. Плошчы, паркі, буйныя грамадскія і дзяржаўныя будынкі Мінска павінны быць упрыгожаны поўнацэннымі творамі выяўленчага мастацтва, якія глыбока і ўсебакова адлюстроўвалі-б нашу гераічную барацьбу, нашу перамогу, наша будаўніцтва.

Пачатак гэтай вялікай працы паклалі ўжо беларускія скульптары сваімі праектамі помнікаў нашым выдатным суайчыннікам—Ф. Скарыне, Я. Купале і К. Заслонаву. Перад намі паўстае задача—дамагчыся найлепшага ажыццяўлення гэтых творчых задум.

Сталінскія пяцігодкі зрабілі Совецкі Саюз магутнейшай дзяржавай і забяспечылі нашу перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне.

За гэтае пяцігоддзе наша Радзіма зробіцца яшчэ больш моцнай і прыгожай.

Совецкі народ ганарыцца тым, што імкіруе ў гэтым будаўніцтве вялікі Сталін, які натхняе нас на нябачаныя працоўныя подзвігі.

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР
А. БЕМБЕЛЬ.

Пачуццё адказнасці

Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1946—1950 г. г. паставіў перад працоўнымі Совецкай Беларусі грандыёзныя і ганаровыя задачы. Няма ніякага сумнення ў тым, што яны будуць выкананы.

Работнікам мастацтва і літаратуры прадастаўляюцца шырокія магчымасці для стварэння новых твораў, што адлюстроўвалі-б нашу сучаснасць.

Тэатр оперы і балета чакае ад беларускіх кампазітараў такіх твораў, якія-б натхнялі нашага гледача на працоўныя подзвігі. У гэтай пяцігодцы нам неабходна стварыць новыя творы операнага і балетнага мастацтва, тэмай якіх з'явілася-б гераічная барацьба совецкага народа на франтах Айчыннай вайны і не менш гераічная барацьба за выкананне планаў Сталінскай пяцігодкі. Беларускім кампазітарам неабходна крытычна аднесціся да выбару лібрэта, каб стварыць оперу, вартую нашай эпохі. Багацце народнай беларускай песні з'яўляецца невычарпальнай крыніцай для творчасці ўсіх музычных форм—оперы, сімфоніі, балета. Пачуццё адказнасці перад совецкім гледачом, веліч Сталінскага плана натхняе нас на ўпартую творчую працу. Плённай сумленнай працай мы адкажам на клопаты і ўвагу нашага народа, нашай партыі аб нас, работніках мастацтва.

І. БАЛОЦІН,
народны артыст БССР.

Даклад т. Жданава аб часопісах „Звезда“ і „Ленинград“*

Таварышы!

З пастановы ЦК ясна, што найбольш грубай памылкай часопіса «Звезда» з'яўляецца прадастаўленне сваіх старонак для літаратурнай «творчасці» Зошчанкі і Ахматавай. Я думаю, што мне няма патрэбы цытаваць тут «твор» Зошчанкі «Прыгоды малпы». Відаць, вы ўсе яго чыталі і ведаеце лепш, чым я. Сэнс гэтага «твору» Зошчанкі заключаецца ў тым, што ён паказвае совецкіх людзей гультаямі і вылюдкамі, людзьмі дурнымі і прымітыўнымі. Зошчанку зусім не цікавіць праца совецкіх людзей, іх намаганні і гераізм, іх высокія грамадскія і маральныя якасці. Гэта тэма заўсёды ў яго адсутнічае. Зошчанка, як мешчанін і пашляк, выбраў сваёй сталай тэмай капанне ў самых нізкіх і дробязных баках побыту. Гэтае капанне ў дробязях побыту не выпадковае. Яно ўласціва ўсім пошлым мяшчанскім пісьменнікам, да якіх належыць і Зошчанка. Аб гэтым многа гаварыў у свой час Горкі. Вы памятаеце, як Горкі на з'ездзе совецкіх пісьменнікаў у 1934 годзе ганьбіў, з дазволу сказаць, «літаратараў», якія далей копаці на кухні і лазні нічога не бачаць.

«Прыгоды малпы» не ёсць для Зошчанкі штосьці такое, што выходзіць за рамкі яго звычайных пісанняў. Гэты «твор» трапіў у поле зроку крытыкі толькі як найбольш яркае выяўленне ўсяго таго адмоўнага, што ёсць у літаратурнай «творчасці» Зошчанкі. Вядома, што з часу звароту ў Ленінград з эвакуацыі Зошчанка напісаў рад рэчаў, якія характэрны тым, што ён не здольны знайсці ў жыцці совецкіх людзей ні адной станоўчай з'явы, ні аднаго станоўчага тыпу. Як і ў «Прыгодах малпы», Зошчанка прывык здзекавацца з совецкага побыту, з совецкіх парадкаў, совецкіх людзей, прыкрываючы гэтыя здзекі маскай пустапарожняй забаўкі і нікчэмнай юмарыстыкі.

Калі вы больш уважліва ўчытаецеся і ўдумаецеся ў апавяданне «Прыгоды малпы», то вы ўбачыце, што Зошчанка надае малае ролю вышэйшага суддзі нашых грамадскіх парадкаў і прымушае чытаць штосьці накшталт маралі совецкім людзям. Малпа пададзена як нейкі разумны пачатак, якой даручана ўстанаўліваць ацэнкі паводзін людзей. Паказ жыцця совецкіх людзей, наўмысна пачварны, карыкатурны і пошлы, спатрэбіўся Зошчанку для таго, каб укласці ў вусны малпе брыдкую, атручаную антысовецкую сентэнцыю наконт таго, што ў заапарку жыць лепш, чым на волі, і што ў клетцы лягчэй дыхаць, чым сярод совецкіх людзей.

Ці можна дайсці да больш нізкай ступені маральнага і палітычнага падзення, і як могуць ленінградцы цярпець на старонках сваіх часопісаў падобную брыдоту і непатрэбства?

Калі «творы» такога гатунку падносяцца совецкім чытачам часопісам «Звезда», дык якой слабай павінна быць пільнасць ленінградцаў, якія кіруюць часопісам «Звезда», каб у ім можна было змяшчаць творы, насычаныя атрутай заалагічнай варожасці да совецкага ладу. Толькі падонкі літаратуры могуць ствараць падобныя «творы», і толькі людзі сляпыя і апалітычныя могуць даваць ім ход.

Гавораць, што апавяданне Зошчанкі абыйшло ленінградскія эстрады. Наколькі павінна было аслабнуць кіраўніцтва ідэалагічнай работай у Ленінградзе, каб падобныя факты маглі мець месца!

Зошчанку з яго мярзотнай мараллю ўдалося пранікнуць на старонкі вялікага ленінградскага часопіса і ўсталявацца там з усімі выгодамі. А часопіс-жа «Звезда»—орган, які павінен выхоўваць нашу моладзь. Але ці можа справіцца з гэтай задачай часопіс, які прытуліў у сябе такога пашляка і несовецкага пісьменніка, як Зошчанку?! Хіба рэдакцыі «Звезды» невядома фізіяномія Зошчанкі?!

Зусім-жа яшчэ нядаўна, у пачатку 1944 года, у часопісу «Большевик» была падвергнута бязлітаснай крытыцы абуральная аповесць Зошчанкі «Перад усходам сонца», напісаная ў разгар вызваленчай вайны совецкага народа супроць нямецкіх захопнікаў. У гэтай аповесці Зошчанка выкручвае навыварат сваю пошлую і нізкую душонку, робячы гэта з асалодай, з смакаваннем, з жаданнем паказаць усім:—глядзіце, вось які я хуліган.

Цяжка падшукаць у нашай літаратуры што-небудзь больш агіднае, чым тая «мараль», якую прапаведуе Зошчанка ў аповесці «Перад усходам сонца», паказваючы людзей і самога сябе як гнусных разбэшчаных звяроў, у якіх няма ні сораму, ні сумлення. І гэтую мараль ён падносіў совецкім чытачам у той перыяд, калі наш народ абліваўся крывёю ў нечувана цяжкай вайне, калі жыццё совецкай дзяржавы вісела на валаску, калі совецкі народ нёс неслічоныя ахвяры ў імя перамогі над немцамі. А Зошчанка, акапаўшыся ў Алма-Ата, у глыбокім тыле, нічым не дапамог у той час совецкаму народу ў яго барацьбе з нямецкімі захопнікамі. Зусім справядліва Зошчанка быў публічна адлупцаваны ў «Большевике», як чужы совецкай літаратуры пасквілянт і пашляк. Ён напляваў тады на грамадскую думку. І вось, не прайшло яшчэ двух год, не прасохла яшчэ чарніла, якім была напісана рэцэнзія ў «Большевике», як той-жа Зошчанка трыумфальна ўязджае ў Ленінград і пачынае вольна разгульваць па старонках ленінградскіх часопісаў. Яго ахвотна друкуе не толькі «Звезда», але і часопіс «Ленинград». Яму ахвотна і з гатоўнасцю прадастаўляюць тэатральныя аўдыторыі. Больш таго, яму даюць магчымасць заняць кіруючае становішча ў Ленінградскім аддзяленні Саюза пісьменнікаў і адыгрываць актыўную ролю ў літаратурных справах Ленінграда. На якой падставе вы даеце Зошчанку разгульваць па садах і парках ленінградскай літаратуры? Чаму партыйны актыў Ленінграда, яго пісьменніцкая арганізацыя дапусцілі гэтыя ганебныя факты?!

Наскрозь гнілая і разлагальная грамадска-палітычная і літаратурная фізіяномія Зошчанкі афармілася не ў самы апошні час. Яго сучасныя «творы» зусім не з'яўляюцца выпадковасцю. Яны з'яўляюцца толькі працягам усёй той літаратурнай «спадчыны» Зошчанкі, якая вядзе пачатак з 20-х гадоў.

Хто такі Зошчанка ў мінулым? Ён з'яўляўся адным з арганізатараў літаратурнай групы так званых «Серапіёнавых братоў». Якой была грамадска-палітычная фізіяномія Зошчанкі ў перыяд арганізацыі «Серапіёнавых братоў»? Дазвольце звярнуцца да часопіса «Литературные записки» № 3 за 1922 год, у якім арганізатары гэтай групы выказвалі сваё крэда. У ліку іншых прызнанняў там змешчаны «сімвал веры» і Зошчанка ў артыкульчыку, які называецца «Аб сабе і яшчэ аб тым аб сім». Зошчанка, нікога і нічога не саромячыся, публічна агаляецца і зусім адкрыта выказвае свае палітычныя, літаратурныя «погляды». Паслухайце, што ён там гаварыў:

«—Наогул пісьменнікам быць вельмі цяжкавата. Скажам, тая-ж ідэалогія... Патрабуецца сёння ад пісьменніка ідэалогія... Гэтакая, сапраўды мне непрыемнасць...»

«Якая, скажыце, можа быць у мяне «дакладная ідэалогія», калі ні адна партыя цалкам мяне не вабіць?».

«З пункту гледжання людзей партыйных я беспрынцыповы чалавек. Няхай. Сам-жа я пра сябе скажу: я не комуніст, не эс-эр, не манархіст, а проста рускі і да таго-ж палітычна амаральны...».

«Чэснае слова даю — не ведаю да гэтага часу, ну вось хоць, скажам, Гучкоў... у якой партыі Гучкоў? А чорт яго ведае, у якой ён партыі. Ведаю: не большэвік, але эс-эр ён або кадэт—не ведаю і ведаць не хачу» і г. д. і да т. п.

Што вы скажаце, таварышы, аб гэтакай «ідэалогіі»? Прайшло 25 год з таго часу, як Зошчанка змясціў гэтую сваю «споведзь». Ці змяніўся ён з таго часу? Непрыкметна. За два з паловай дзесятка год ён не толькі нічаму не навучыўся і не толькі ніяк не змяніўся, а, наадварот, з цынічнай шчырасцю прадаўжае заставацца прапаведнікам безыдэйнасці і пошласці, беспрынцыпным і бессаромным літаратурным хуліганам. Гэта азначае, што Зошчанку як тады, так і цяпер не падабаюцца совецкія парадкі. Як тады, так і цяпер ён чужы і варожы совецкай літаратуры. Калі пры ўсім гэтым Зошчанка ў Ленінградзе зрабіўся ледзь не карыфеем літаратуры, калі яго выслаўляюць на ленінградскім Парнасе, то астаецца толькі здзіўляцца таму, да якой ступені беспрынцыповасці, непатрабавальнасці, неспагальнасці і неразборлівасці маглі дайсці людзі, якія пракладваюць дарогу Зошчанку і спяваюць яму славаслоўі!

Дазвольце прывесці яшчэ адну ілюстрацыю аб фізіяноміі так званых «Серапіёнавых братоў». У тых-жа «Литературных записках» № 3 за 1922 год другі серапіёнавец Леў Лунц таксама прабуе даць ідэйнае абгрунтаванне таго шкоднага і чужога совецкай літаратуры напрамку, які прадстаўляла група «Серапіёнавых братоў». Лунц піша:

«Мы сабраліся ў дні рэволюцыйнага, у дні магутнага палітычнага напружання. «Хто не з намі, той супроць нас!»—гаварылі нам справа і злева,—з кім-жа вы, Серапіёнавы браты—з комуністамі або супроць комуністаў, за рэволюцыю або супроць рэволюцыі?»

«З кім-жа мы, Серапіёнавы браты? Мы з пустэльнікам Серапіёнам»...

«Надта доўга і пакутліва кіравала рускай літаратурай грамадскасць... Мы не хочам утылітарызма. Мы пішам не для прапаганды. Мастацтва рэальна, як само жыццё і, як само жыццё, яно без мэты і без сэнсу, існуе таму, што не можа не існаваць».

Такая роля, якую «Серапіёнавы браты» адводзяць мастацтву, адбіраючы ў яго ідэйнасць, грамадскае значэнне, абвяшчаючы безыдэйнасць мастацтва, мастацтва дзеля мастацтва, мастацтва без мэты і без сэнсу. Гэта і ёсць пропаведзь гнілога апалітыцызма, мяшчанства і пошласці.

Які вывад вынікае з гэтага? Калі Зошчанку не падабаюцца совецкія парадкі, што-ж загадаеце: прыстасоўвацца да Зошчанкі? Не нам-жа змяняць густы. Не нам-жа перабудоўваць наш побыт і наш лад пад Зошчанку. Няхай ён перабудоўваецца, а не хоча перабудоўвацца—няхай ідзе прэч з совецкай літаратуры. У совецкай літаратуры не можа быць месца гнілым, пустым, безыдэйным і пошлым творам. **(Бурныя апладысменты).**

Вось з чаго зыходзіў ЦК, прымаючы рашэнне аб часопісах «Звезда» і «Ленинград».

Пераходжу да пытання аб літаратурнай «творчасці» Анны Ахматавай. Яе творы за апошні час з'яўляюцца ў ленінградскіх часопісах у парадку «пашыранага ўзнаўлення». Гэта таксама дзіўна і ненатуральна, як калі-б хто-небудзь цяпер пачаў перавыдаваць творы Мережкоўскага, Вячэслава Іванова, Міхаіла Кузьміна, Андрэя Белага, Зінаіды Гіпіус, Фёдара Салагуба, Зіноўевай-Аннібал і г. д. і да т. п., г. зн. усіх тых, каго наша перадавая грамадскасць і літаратура заўсёды лічылі прадстаўнікамі рэакцыйнага мракабесся і рэнегацтва ў палітыцы і мастацтве.

Горкі ў свой час гаварыў, што дзесяцігоддзе 1907—1917 гадоў заслугоўвае імя самага ганебнага і самага бяздарнага дзесяцігоддзя ў гісторыі рускай інтэлігенцыі, калі пасля рэволюцыі 1905 года значная частка інтэлігенцыі адвярнулася ад рэволюцыі, скацілася ў балота рэакцыйнай містыкі і парнаграфіі, абвясціла безыдэйнасць сваім сцягам, прыкрыўшы сваё рэнегацтва «прыгожай» фразай: «І я спаліў усё, чаму пакланяўся, пакланіўся таму, што спальваў». Іменна ў гэтае дзесяцігоддзе з'явіліся такія рэнегацкія творы, як «Конь бледны» Ропшына, творы Вінічэнкі і іншых дэзертыраў з лагера рэволюцыі ў лагер рэакцыі, якія спяшаліся развянчаць тыя высокія ідэалы, за якія змагалася лепшая, перадавая частка рускага грамадства. На свет усплылі сімвалісты, імажыністы, дэкадэнты ўсіх масцей, якія адракаліся ад народа, абвясцілі тэзіс «мастацтва дзеля мастацтва», якія прапаведвалі безыдэйнасць у літаратуры, прыкрывалі сваё ідэйнае і маральнае разлажэнне пагоняй за прыгожай формай без зместу. Усіх іх яднаў звярыны страх перад пролетарскай рэволюцыяй, што надыходзіла. Досыць нагадаць, што адным з буйнейшых «ідэолагаў» гэтых рэакцыйных літаратурных плыней быў Мережкоўскі, які называў надыходзячую пролетарскую рэволюцыю «надыходзячым Хамам» і сустрэў Кастрычніцкую рэволюцыю заалагічнай злосцю.

Анна Ахматава з'яўляецца адным з прадстаўнікоў гэтага безыдэйнага рэакцыйнага літаратурнага балота. Яна належыць да так званай літаратурнай групы акмеістаў, якія выйшлі ў свой час з радоў сімвалістаў, і з'яўляецца адным з сцяганосцаў пустой, безыдэйнай, арыстакратычна-салоннай паэзіі, абсалютна чужой совецкай літаратуры. Акмеісты ўяўлялі з сябе крайне індывідуалістычны напрамак у мастацтве. Яны прапаведвалі тэорыю «мастацтва для мастацтва», «харастко дзеля самога харастка», ведаць нічога не жадалі аб народзе, аб яго патрэбах і інтарэсах, аб грамадскім жыцці.

Па социяльных сваіх вытоках гэта была дваранска-буржуазная плынь у літаратуры ў той перыяд, калі дні арыстакратыі і буржуазіі былі падлічаны і калі паэты і ідэолагі пануючых класаў імкнуліся схавацца ад непрыемнай рэчаіснасці ў захмарныя вышыні і туманы рэлігійнай містыкі, у мізэрныя асабістыя перажыванні і капанне ў сваіх дробных душонках. Акмеісты, як і сімвалісты, дэкадэнты і іншыя прадстаўнікі дваранска-буржуазнай ідэалогіі, якая разлагалася, былі прапаведнікамі ўпадніцтва, песімізма, веры ў патойбаковы свет.

Тэматыка Ахматавай наскрозь індывідуалістычная. Да ўбоства абмежаваны дыяпазон яе паэзіі, — паэзіі ашалелай пані, якая мітусіцца паміж будуарам і мальленняй. Асноўнае ў яе — гэта кахальна-эратычныя матывы, пераплеценыя з матывамі суму, тугі, смерці, містыкі, асуджанасці. Пачуццё асуджанасці, — пачуццё, зразумелае для грамадскай свядомасці групы, якая вымірае,—змрочныя тоны перадсмяротнай безнадзейнасці, містычныя перажыванні напалову з эротыкай — такі духоўны свет Ахматавай, аднаго з асколкаў свету, які беззваротна знік навечна, свету старой дваранскай культуры, «добрых старых екацярынінскіх часоў». Не то манахіня, не то распусніца, а больш правільна распусніца і манахіня, у якой распуста змешана з малітвай.

«Но клянусь тебе ангельским садом,
Чудотворной иконой клянусь
И ночей наших пламенных чадом...»

(Ахматава „Anna Domini“).

Такая вось Ахматава з яе маленькім, вузкім асабістым жыццём, нікчэмнымі перажываннямі і рэлігійна-містычнай эротыкай.

Ахматаўская паэзія зусім далёкая ад народа. Гэта—паэзія дзесяці тысяч верхніх старой дваранскай Расіі, асуджаных, якім нічога ўжо не заставалася, як толькі ўздыхаць па «добраму старому часу». Памешчыцкія сядзібы екацярынінскіх часоў з стогадовымі ліпавымі алеямі, фантанамі, статуямі і каменнымі аркамі, аранжарэямі, альтанкамі кахання і заімшэлымі гербамі на брамах. Дваранскі Пецярбург, Царскае Сяло, вакзал у Паўлаўску і іншыя рэліквіі дваранскай культуры. Усё гэта знікла ў беззваротнае мінулае! Асколкам гэтай далёкай, чужой народу культуры, якія нейкім цудам захаваліся да нашых часоў, нічога ўжо не застаецца рабіць, як толькі замкнуцца ў сабе і жыць хімерамі. «Усё раскрадзена, здраджана, прададзена»,— так піша Ахматава.

Аб грамадска-палітычных і літаратурных ідэалах акмеістаў адзін з найбольш прыкметных прадстаўнікоў гэтай групкі, Осіп Мандэльштам, незадоўга да рэволюцыі пісаў: «Любоў да арганізма і арганізацыі акмеісты падзяляюць з фізіялагічна геніяльным сярэдневякоўем»... «Сярэдневякоўе, вызначаючы па-свойму ўдзельную вагу чалавека, адчувала і прызнавала яго за кожным, зусім незалежна ад яго заслуг»... «Так, Еўропа прайшла скрозь лабірынт ажурна-тонкай культуры, калі абстрактнае быццё, нічым не прыфарбаванае асабістае існаванне цанілася як подзвіг. Адсюль арыстакратычная інтымнасць, што звязвае ўсіх людзей, такая чужая па духу «роўнасці і братэрству» вялікай рэволюцыі»... «Сярэдневякоўе дорага нам таму, што валодала ў высокай ступені пачуццём грані і перагародак»... «Высокародная сумесь разважлівасці і містыкі і адчуванне свету, як жывой роўнавагі, збліжае нас з гэтай эпохай і прымушае чэрпаць сілы ў творах, што ўзніклі на раманскай глебе каля 1200 года».

У гэтых выказваннях Мандэльштама разгорнуты спадзяванні і ідэалы акмеістаў. «Назад да сярэдневякоўя»—такі грамадскі ідэал гэтай арыстакратычна-салоннай групы. Назад да малпы — пераклікаецца з ёй Зошчанка. Дарэчы сказаць, і акмеісты, і «Серапіёнавы браты» вядуць сваю радаслоўную ад агульных продкаў. І ў акмеістаў, і ў «Серапіёнавых братоў» агульным родапачынальнікам з'яўляўся Гофман, адзін з заснавальнікаў арыстакратычна-салоннага дэкадэнцтва і містыцызма.

Чаму раптам спатрэбілася папулярызаваць паэзію Ахматавай? Якія яна мае адносіны да нас, совецкіх людзей? Чаму трэба прадастаўляць літаратурную трыбуну ўсім гэтым упадніцкім і глыбока чужым нам літаратурным напрамкам?

З гісторыі рускай літаратуры мы ведаем, што не раз і не два рэакцыйныя літаратурныя плыні, да якіх адносіліся і сімвалісты, і акмеісты, спрабавалі абвяшчаць паходы супроць вялікіх рэволюцыйна-дэмакратычных традыцый рускай літаратуры, супроць яе перадавых прадстаўнікоў; спрабавалі пазбавіць літаратуру яе высокага, ідэйнага і грамадскага значэння, звесці яе ў балота безыдэйнасці і пошласці. Усе гэтыя «модныя» плыні адышлі ў Лету і былі скінуты ў мінулае разам з тымі класамі, ідэалогію якіх яны адлюстроўвалі. Усе гэтыя сімвалісты, акмеісты, «жоўтыя кофты», «бубновыя валеты», «нічавокі»,—што ад іх засталося ў нашай роднай рускай, совецкай літаратуры? Роўна нічога, хоць іх паходы супроць вялікіх прадстаўнікоў рускай рэволюцыйна-дэмакратычнай літаратуры —Бялінскага, Дабралюбава, Чарнышэўскага, Герцэна, Салтыкова-Шчадрына —задумваліся з вялікім шумам і прэтэнцыёзнасцю і з такім-жа эфектам правальваліся.

Акмеісты абвясцілі: «Не ўносіць ніякіх паправак у быццё і ў крытыку апошняга не ўдавацца». Чаму яны былі супроць унясення якіх-бы там ні было паправак у быццё? Ды таму, што гэтае старое дваранскае, буржуазнае быццё ім падабалася, а рэволюцыйны народ збіраўся патурбаваць гэтае іх быццё. У кастрычніку 1917 года былі вытрушаны ў смеццевую яму гісторыі як кіруючыя класы, так і іх ідэолагі і апявальнікі.

І раптам на 29-м годзе социялістычнай рэволюцыі з'яўляюцца зноў на сцэну некаторыя музейныя рэдкасці з свету ценей і пачынаюць павучаць нашу моладзь, як трэба жыць. Перад Ахматавай шырока раскрываюць вароты ленінградскага часопіса і ёй свабодна прадастаўляецца атручваць свядомасць моладзі разлагальным духам сваёй паэзіі.

У часопісе «Ленинград», у адным з нумароў, апублікавана штосьці накшталт зводкі твораў Ахматавай, напісаных у перыяд з 1909 да 1944 года. Там, побач з іншым хламам, ёсць адзін верш, напісаны ў эвакуацыі ў часе Вялікай Айчыннай вайны. У гэтым вершы яна піша аб сваім адзіноцтве, якое яна вымушана дзяліць з чорным катом. Глядзіць на ле чорны кот, як вока стагоддзя. Тэма не новая. Пра чорнага ката Ахматава пісала і ў 1909 годзе. Настроі адзіноцтва і безвыходнасці, чужыя совецкай літаратуры, звязваюць увесь гістарычны шлях «творчасці» Ахматавай.

Што агульнага паміж гэтай паэзіяй, інтарэсамі нашага народа і дзяржавы? Роўна нічога. Творчасць Ахматавай—спраза далёкага мінулага; яна чужая сучаснай совецкай рэчаіснасці і яе нельга цярпець на старонках нашых часопісаў. Наша літаратура — не прыватнае прадпрыемства, разлічанае на тое, каб патрапляць розным густам літаратурнага рынка. Мы зусім не абавязаны прадастаўляць у нашай літаратуры месца для густаў і нораваў, якія не маюць нічога агульнага з мараллю і якасцямі совецкіх людзей. Што павучальнага могуць даць творы Ахматавай нашай моладзі? Нічога, апрача шкоды. Гэтыя творы могуць толькі пасеяць смутак, упадак духу, песімізм, імкненне адыйсці ад надзённых пытанняў грамадскага жыцця, адыйсці ад шырокай дарогі грамадскага жыцця і дзейнасці ў вузенькі свет асабістых перажыванняў. Як можна аддаць у яе рукі выхаванне нашай моладзі?! А між тым Ахматаву з вялікай гатоўнасцю друкавалі то ў «Звезде», то ў «Ленинграде», ды яшчэ асобнымі зборнікамі выдавалі. Гэта грубая палітычная памылка.

Не выпадкова з прычыны ўсяго гэтага, што ў ленінградскіх часопісах пачалі з'яўляцца творы другіх пісьменнікаў, якія пачалі спаўзаць на пазіцыі безыдэйнасці і ўпадніцтва. Я маю на ўвазе такія творы, як творы Садоф'ева і Камісаравай. У некаторых сваіх вершах Садоф'еў і Камісарава пачалі падпяваць Ахматавай, пачалі культываваць настроі суму, смутку і адзіноты, якія так прыемны для душы Ахматавай.

Няма чаго і гаварыць, што такія настроі або пропаведзь такіх настрояў можа аказваць толькі адмоўны ўплыў на нашу моладзь, можа атруціць яе свядомасць гэтым духам безыдэйнасці, апалітычнасці, смутку.

А што было-б, калі-б мы выхоўвалі моладзь у духу смутку і нявер'я ў нашу справу? А было-б тое, што мы не перамаглі-б у Вялікай Айчыннай вайне. Іменна таму, што совецкая дзяржава і наша партыя з дапамогай совецкай літаратуры выхавалі нашу моладзь у духу бадзёрасці, упэўненасці ў сваіх сілах, іменна таму мы пераадолелі самыя вялікія цяжкасці ў будаўніцтве социялізма і дамагліся перамогі над немцамі і японцамі.

Што з усяго гэтага вынікае? З гэтага вынікае, што часопіс «Звезда», які змяшчаў на сваіх старонках, побач з творамі добрымі, ідэйнымі, бадзёрымі, творы безідэйныя, пошлыя, рэакцыйныя, зрабіўся часопісам без напрамку, зрабіўся часопісам, які дапамагаў ворагам разлагаць нашу моладзь. А нашы часопісы былі заўсёды моцныя сваім бадзёрым, рэволюцыйным напрамкам, а не эклектыкай, не безыдэйнасцю і апалітыцызмам. Прапаганда безідэйнасці атрымала роўнапраўе ў «Звезде». Мала таго, высвятляецца, што Зошчанка набыў такую сілу сярод пісьменніцкай арганізацыі Ленінграда, што нават пакрыкваў на нязгодных, пагражаў крытыкам прапісаць у адным з чарговых твораў. Ён стаў чымсьці накшталт літаратурнага дыктатара. Яго абкружала група паклоннікаў, ствараючы яму славу.

Паўстае пытанне, на якой падставе? Чаму вы дапусцілі гэтую супроцьнатуральную і рэакцыйную справу?

Не выпадкова, што ў літаратурных часопісах Ленінграда пачалі захапляцца сучаснай нізкапробнай буржуазнай літаратурай Захада. Некаторыя нашы літаратары пачалі разглядаць сябе не як настаўнікаў, а як вучняў буржуазна-мяшчанскіх літаратараў, пачалі збівацца на тон нізкапаклонства і схіляцца перад мяшчанскай замежнай літаратурай. Ці да твару нам, совецкім патрыётам, такое нізкапаклонства, нам, якія пабудавалі совецкі лад, што ў сто разоў вышэйшы і лепшы за ўсякі буржуазны лад? Ці да твару нашай перадавой совецкай літаратуры, якая з'яўляецца самай рэволюцыйнай літаратурай у свеце, нізкапаклонства перад абмежаванай мяшчанска-буржуазнай літаратурай Захада?

Буйным недахопам работы нашых пісьменнікаў з'яўляецца таксама аддаленне ад сучаснай совецкай тэматыкі, аднабаковае захапленне гістарычнай тэматыкай, з аднаго боку, а з другога боку, спроба заняцца пустапарожнімі сюжэтамі, якія носяць характар забавы. Некаторыя пісьменнікі ў апраўданне свайго адставання ад вялікіх сучасных совецкіх тэм гавораць, што надыйшоў час, калі народу трэба даць пуставатую літаратуру, якая-б забаўляла, калі з ідэйнасцю твораў можна не лічыцца. Гэта глыбока няправільнае ўяўленне аб нашым народзе, яго запатрабаваннях, інтарэсах. Наш народ чакае, каб совецкія пісьменнікі асэнсавалі і абагулілі велізарны вопыт, які народ набыў у Вялікай Айчыннай вайне, каб яны паказалі і абагулілі той гераізм, з якім народ цяпер працуе над аднаўленнем народнай гаспадаркі краіны пасля выгнання ворагаў.

Некалькі слоў наконт часопіса «Ленинград». Тут у Зошчанкі пазіцыя яшчэ больш «трывалая», чым у «Звезде», таксама, як і ў Ахматавай. Зошчанка і Ахматава зрабіліся актыўнай літаратурнай сілай у абодвух часопісах. Часопіс «Ленинград», такім чынам, нясе адказнасць за тое, што ён прадставіў свае старонкі такім пашлякам, як Зошчанка, і такім салонным паэтэсам, як Ахматава.

Але ў часопіса «Ленинград» ёсць і іншыя памылкі.

Вось, напрыклад, пародыя на «Яўгенія Анегіна», напісаная нейкім Хазіным. Называецца гэтая рэч «Зварот Анегіна». Гавораць, што яна нярэдка выконваецца на падмостках ленінградскай эстрады. Незразумела, чаму ленінградцы дапускаюць, каб з публічнай трыбуны шальмавалі Ленінград, як гэта робіць Хазін? Бо сэнс усёй гэтай так званай літаратурнай «пародыі» заключаецца не ў пустым зубаскальстве адносна прыгод, што здарыліся з Анегіным, які аказаўся ў сучасным Ленінградзе. Сэнс пасквіля, створанага Хазіным, заключаецца ў тым, што ён спрабуе параўноўваць наш сучасны Ленінград з Пецярбургам пушкінскай эпохі і даказваць, што наш век горшы за век Анегіна. Прыгледзьцеся хоць-бы да некаторых радкоў гэтай «пародыі». Усё ў нашым сучасным Ленінградзе аўтару не падабаецца. Ён злосна хальнічае, узводзіць паклёп на совецкіх людзей, на Ленінград. Іншая справа век Анегіна—залаты век, на думку Хазіна. Цяпер не тое,—з'явіўся жыладзел, карткі, прапускі. Дзяўчаты, тыя няземныя эфірныя істоты, якімі раней захапляўся Анегін, зрабіліся цяпер рэгуліроўшчыкамі вулічнага руху, рамантуюць ленінградскія дамы і г. д. і да т. п. Дазвольце працытаваць адно толькі месца з гэтай «пародыі»:

«В трамвай садится наш Евгений.
О, бедный, милый человек!
Не знал таких передвижений
Его непросвещённый век.
Судьба Евгения хранила,
Ему лишь ногу отдавило,
И только раз, толкнув в живот,
Ему сказали: «Идиот!»
Он, вспомнив древние порядки,
Решил дуэлью кончить спор,
Полез в карман... Но кто-то спёр
Уже давно его перчатки,
За неименьем таковых
Смолчал Онегин и притих».

Вось які быў Ленінград і якім ён зрабіўся цяпер: дрэнным, некультурным, грубым і ў якім непрыглядным выглядае ён паўстаў перад бедным, мілым Анегіным. Вось якім прадставіў Ленінград і ленінградцаў пашляк Хазін.

Дрэнная, заганная, гнілая задума ў гэтай паклёпніцкай пародыі!

Як-жа магла рэдакцыя «Ленинграда» праглядзець гэты злосны паклёп на Ленінград і яго цудоўных людзей?! Як можна пускаць хазіных на старонкі ленінградскіх часопісаў?!

Вазьміце другі твор—пародыю на пародыю аб Някрасаве, складзеную такім чынам, што яна ўяўляе з сябе прамую знявагу памяці вялікага паэта і грамадскага дзеяча, якім быў Някрасаў, знявагу, супроць якой павінен быў-бы абурыцца ўсякі адукаваны чалавек. Адгэк, рэдакцыя «Ленинграда» ахвотна змясціла гэтае бруднае варыва на сваіх старонках.

Што-ж мы яшчэ знаходзім у часопісе «Ленинград»? Замежны анекдот, плоскі і пошлы, узяты, відаць, са старых пашарпаных зборнікаў анекдотаў канца мінулага стагоддзя. Хіба часопісу «Ленинград» няма чым запоўніць свае старонкі? Хіба няма аб чым пісаць у часопісе «Ленинград»? Вазьміце хоць-бы такую тэму, як аднаўленне Ленінграда. У горадзе ідзе выдатная работа, горад загойвае раны, нанесеныя блакадай, ленінградцы поўны энтузіязма і пафаса пасляваеннага аднаўлення. Ці напісана што-небудзь аб гэтым у часопісе «Ленинград»? Ці дачакаюцца калі-небудзь ленінградцы, каб іх працоўныя подзвігі знайшлі адлюстраванне на старонках часопіса?

(Працяг на 3-й стар.)

*) Скарочаная і абагуленая стэнаграма дакладаў т. Жданава на сходзе партыйнага актыва і на сходзе пісьменнікаў у Ленінградзе.

Даклад т. Жданава аб часопісах „Звезда“ і „Ленинград“

(ПРАЦЯГ)

Возьміце далей тэму аб совецкай жанчыне. Хіба можна культываваць сярод совецкіх чытачоў і чытачак уласцівыя Ахматавай ганебныя погляды на ролю і прызначэнне жанчыны, не даючы сапраўды праўдзівага ўяўлення аб сучаснай совецкай жанчыне наогул, аб ленінградскай дзяўчыне і жанчыне-гераіні ў прыватнасці, якія вынеслі на сваіх плячах велізарныя цяжкасці ваенных гадоў, самааддана працуюць цяпер над вырашэннем цяжкіх задач аднаўлення гаспадаркі?

Як відаць, становішча спраў у ленінградскім аддзяленні Саюза пісьменнікаў такое, што ў сучасны момант добрых твораў для двух літаратурна-мастацкіх часопісаў яўна нехапае. Вось чаму Цэнтральны Камітэт партыі вырашыў закрыць часопіс «Ленинград» з тым, каб сканцэнтраваць усе лепшыя літаратурныя сілы ў часопісе «Звезда». Гэта, вядома, не азначае, што Ленінград пры належных умовах не будзе мець другога або нават трэцяга часопіса. Пытанне вырашаецца колькасцю добрых, высокаякасных твораў. Калі іх з'явіцца досыць многа і ім не будзе хапаць месца ў адным часопісе, можна будзе стварыць другі і трэці часопіс, толькі-б нашы ленінградскія пісьменнікі давалі добрую ў ідэйных і мастацкіх адносінах прадукцыю.

Такія вось грубыя памылкі і недахопы, ускрытыя і адзначаныя ў пастанове ЦК ВКП(б) адносна работы часопісаў «Звезда» і «Ленинград».

У чым корань гэтых памылак і недахопаў?

Корань гэтых памылак і недахопаў заключаецца ў тым, што рэдактары названых часопісаў, дзеячы нашай совецкай літаратуры, а таксама кіраўнікі нашага ідэалагічнага фронта ў Ленінградзе забыліся пра некаторыя асноўныя палажэнні ленінізма аб літаратуры. Многія з пісьменнікаў і з тых, якія працуюць у якасці адказных рэдактараў або займаюць важныя пасады ў Саюзе пісьменнікаў, думаюць, што палітыка—гэта справа ўрада, справа ЦК. Што датычыць літаратараў, дык не іх справа займацца палітыкай. Напісаў чалавек добра, па-мастацку, прыгожа—трэба пусціць у ход, не гледзячы на тое, што там ёсць гнілыя месцы, якія дэзарыентуюць нашу моладзь, атручваюць яе. Мы патрабуем, каб нашы таварышы як кіраўнікі літаратуры, так і тыя, што пішуць, кіраваліся тым, без чаго совецкі лад не можа жыць, г. зн. палітыкай, каб нам выхоўваць моладзь не ў духу наплывізма і безыдэйнасці, а ў духу бадзёрасці і рэволюцыйнасці.

Вядома, што ленінізм увасобіў у сабе ўсе лепшыя традыцыі рускіх рэволюцыянераў-дэмакратаў XIX века і што наша совецкая культура ўзнікла, развілася і дасягнула росквіту на базе крытычна пераапрацаванай культурнай спадчыны мінулага. У галіне літаратуры наша партыя вустамі Леніна і Сталіна неаднаразова прызнавала велізарнае значэнне вялікіх рускіх рэволюцыйна-дэмакратычных пісьменнікаў і крытыкаў—Бялінскага, Дабралюбава, Чарнышэўскага, Салтыкова-Шчадрына, Пляханава. Пачынаючы з Бялінскага, усе лепшыя прадстаўнікі рэволюцыйна-дэмакратычнай рускай інтэлігенцыі не прызнавалі так званага «чыстага мастацтва», «мастацтва для мастацтва» і былі вестунамі мастацтва для народа, яго высокай ідэйнасці і грамадскага значэння. Мастацтва не можа адлучыць сябе ад лёсу народа. Успомніце вядомае «Пісьмо да Гогаля» Бялінскага, у якім вялікі крытык з усёй уласцівай яму палымяннасцю бічаваў Гогаля за яго спробу здрадзіць справе народа і перайсці на бок цара. Гэтае пісьмо Ленін назваў адным з лепшых твораў бесцэнзурнага дэмакратычнага друку, які захаваў велізарнае літаратурнае значэнне і да гэтага часу.

Успомніце літаратурна-публіцыстычныя артыкулы Дабралюбава, у якіх з такой сілай паказана грамадскае значэнне літаратуры. Уся наша руская рэволюцыйна-дэмакратычная публіцыстыка насычана смяротнай нянавісцю да царскага ладу і прасякнута высокародным імкненнем змагацца за карэнныя інтарэсы народа, за яго асвету, за яго культуру, за яго вызваленне ад ланцугоў царскага рэжыма. Баявое мастацтва, якое вядзе барацьбу за лепшыя ідэалы народа—так уяўлялі сабе літаратуру і мастацтва вялікія прадстаўнікі рускай літаратуры. Чарнышэўскі, які з усіх утапічных социялістаў бліжэй за ўсіх падышоў да навуковага социялізма і ад твораў якога, як указваў Ленін, «павявала духам класавай барацьбы»,—вучыў таму, што задачай мастацтва з'яўляецца, апрача пазнання жыцця, яшчэ і задача навучыць людзей правільна ацэньваць тыя ці іншыя грамадскія з'явы. Бліжэйшы яго прыяцель і паплечнік Дабралюбаў указваў, што «не жыццё ідзе па літаратурных нормах, а літаратура прыстасоўваецца адпаведна напрамкам жыцця», і ўзмоцнена прапагандаваў прынцыпы рэалізма і народнасці ў літаратуры, лічачы, што асновай мастацтва з'яўляецца рэчаіснасць, што яна з'яўляецца крыніцай творчасці і што мастацтва мае актыўную ролю ў грамадскім жыцці, фарміруючы грамадскую свядомасць. Паводле Дабралюбава, літаратура павінна служыць грамадству, павінна даваць народу адказы на самыя вострыя пытанні сучаснасці, павінна быць на ўзроўні ідэй сваёй эпохі.

Марксісцкая літаратурная крытыка, якая з'яўляецца прадаўжальніцай вялікіх традыцый Бялінскага, Чарнышэўскага, Дабралюбава, заўсёды была прыхільніцай рэалістычнага, грамадска накіраванага мастацтва. Пляханаў многа папрацаваў для таго, каб выкрыць ідэалістычнае, антынавуковае ўяўленне аб літаратуры і мастацтве і абараніць асноўныя палажэнні нашых вялікіх рускіх рэволюцыянераў-дэмакратаў, якія вучылі бачыць у літаратуры магутны сродак служэння народу.

В. І. Ленін першы аформіў з гранічнай выразнасцю адносіны перадавой грамадскай думкі да літаратуры і мастацтва. Я напомню вам вядомы артыкул Леніна «Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура», напісаны ў канцы 1905 года, у якім ён з уласцівай яму сілай паказаў, што літаратура не можа быць беспартыйнай, што яна павінна быць важнай састаўной часткай агульнай пролетарскай справы. У гэтым артыкуле Леніна закладзены ўсе асновы, на якіх базуецца развіццё нашай совецкай літаратуры. Ленін пісаў:

«Літаратура павінна стаць партыйнай. У процівагу буржуазным норавам, у процівагу буржуазнаму прадпрыймальніцкаму, гандлярскаму друку, у процівагу буржуазнаму літаратурнаму кар'ерызму і індывідуалізму, «барскаму анархізму» і пагоні за нажывай,—социялістычны пролетарыят павінен высунуць прынцып **партыйнай літаратуры**, развіць гэты прынцып і правесці яго ў жыццё ў магчыма больш поўнай і цэласнай форме».

«У чым-жа заключаецца гэты прынцып партыйнай літаратуры? Не толькі ў тым, што для социялістычнага пролетарыята літаратурная справа не можа быць сродкам нажывы асоб або груп, яна не можа быць наогул індывідуальнай справай, незалежнай ад агульнай пролетарскай справы. Далоў літаратараў беспартыйных! Далоў літаратараў звышчалавекаў! Літаратурная справа павінна стаць **часткай** агульнапролетарскай справы...»

І далей, у тым-жа артыкуле:

«Жыць у грамадстве і быць свабодным ад грамадства нельга. Свабода буржуазнага пісьменніка, мастака, актрысы ёсць толькі замаскаваная (або, якая крывадушна маскуецца) залежнасць ад грашовага мяшка, ад подкупу, ад утрымання».

Ленінізм зыходзіць з таго, што наша літаратура не можа быць апалітычнай, не можа прадстаўляць з сябе «мастацтва для мастацтва», а заклікана ажыццяўляць важную перадавую ролю ў грамадскім жыцці. Адсюль зыходзіць ленінскі прынцып партыйнасці літаратуры — важнейшы ўклад В. І. Леніна ў навуку аб літаратуры.

Значыць, лепшая традыцыя совецкай літаратуры з'яўляецца прадаўжэннем лепшых традыцый рускай літаратуры XIX стагоддзя, традыцый, створаных нашымі вялікімі рэволюцыйнымі дэмакратамі—Бялінскім, Дабралюбавым, Чарнышэўскім, Салтыковым-Шчадрыным, прадоўжаных Пляханавым і навукова распрацаваных і абгрунтаваных Леніным і Сталіным.

Некрасаў называў сваю паэзію «музай помсты і смутку». Чарнышэўскі і Дабралюбаў разглядалі літаратуру як святое служэнне народу. Лепшыя прадстаўнікі расійскай дэмакратычнай інтэлігенцыі ва ўмовах царскага ладу гінулі за гэтыя добародныя высокія ідэі, ішлі на катаргу, у выгнанне. Як-жа можна забыць гэтыя слаўныя традыцыі? Як можна зняважыць іх, як можна дапусціць, каб ахматавы і зошчанкі прасоўвалі рэакцыйны лозунг «мастацтва для мастацтва», каб, прыкрываючыся маскай безыдэйнасці, навязвалі чужыя совецкаму народу ідэі?!...

Ленінізм прызнае за нашай літаратурай велізарнае грамадска-пераўтваральнае значэнне. Калі-б наша совецкая літаратура дапусціла зніжэнне гэтай сваёй велізарнай выхаваўчай ролі—гэта азначала-б развіццё назад, зварот «да каменнага веку».

Таварыш Сталін назваў нашых пісьменнікаў інжынерамі чалавечых душ. Гэтае азначэнне мае глыбокі сэнс. Яно гаворыць аб велізарнай адказнасці совецкіх пісьменнікаў за выхаванне людзей, за выхаванне совецкай моладзі, за недапушчэнне браку ў літаратурнай рабоце.

Некаторым здаецца дзіўным, чаму ЦК прыняў такія крутыя меры па літаратурнаму пытанню? У нас не прызвычаіліся да гэтага. Лічаць, што калі дапушчаны брак у вытворчасці або не выканана вытворчая праграма па шырспажыву або не выкананы план нарыхтовак лесу,—то аб'явіць за гэта вымову натуральная справа **(адабральны смех у зале)**, а вось калі дапушчаны брак у адносінах выхавання чалавечых душ, калі дапушчаны брак у справе выхавання моладзі, то тут можна і пацярпець. Між тым, хіба гэта не больш горшая віна, чым невыкананне вытворчай праграмы або зрыў вытворчага задання? Сваім рашэннем ЦК мае на ўвазе падцягнуць ідэалагічны фронт да ўсіх іншых участкаў нашай работы.

За апошні час на ідэалагічным фронце выявіліся вялікія прарывы і недахопы. Досыць напомніць вам аб адставанні нашага кіномастацтва, аб засмечанні нядобраякаснымі творамі нашага тэатральна-драматычнага рэпертуара, не гаворачы аб тым, што адбылося ў часопісах «Звезда» і «Ленинград». ЦК вымушаны быў умяшацца і рашуча паправіць справу. Ён не меў права змякчаць свайго ўдару супроць тых, хто забывае свае абавязкі ў адносінах да народа, у адносінах да выхавання моладзі. Калі мы хочам павярнуць увагу нашага актыва да пытанняў ідэалагічнай работы і навесці тут парадак, даць выразны напрамак у рабоце, мы павінны востра, як належыць совецкім людзям, як належыць большэвікам, раскрытыкаваць памылкі і недахопы ідэалагічнай работы. Толькі тады мы здолеем паправіць справу.

Некаторыя літаратары разважаюць так: паколькі за час вайны народ згаладаўся па літаратуры, кніг выпушчалі мала, пастолькі чытач праглыне ўсялякі тавар, хоць-бы і з гнільцой. А між тым, гэта зусім не так, і мы не можам цярпець усякую літаратуру, якая будзе надсоўвацца нам неразборлівымі літаратарамі, рэдактарамі, выдаўцамі. Совецкі народ чакае ад совецкіх пісьменнікаў сапраўднага ідэйнага ўзбраення, духоўнай ежы, якая дапамагла-б выкананню планаў вялікага будаўніцтва, выкананню планаў аднаўлення і далейшага развіцця народнай гаспадаркі нашай краіны. Совецкі народ прад'яўляе высокія патрабаванні да літаратараў, хоча задавальнення сваіх ідэйных і культурных запатрабаванняў. У часе вайны з прычыны абставін мы не маглі забяспечыць гэтых надзённых запатрабаванняў. Народ хоча асэнсаваць падзеі, што адбываюцца. Яго ідэйны і культурны ўзровень вырас. Ён часта не задавальняецца якасцю тых твораў літаратуры і мастацтва, якія ў нас з'яўляюцца. Гэтага не зразумелі і не хочуць разумець некаторыя работнікі літаратуры, работнікі ідэалагічнага фронта.

Узровень патрабаванняў і густаў нашага народа ўзняўся вельмі высока, і той, хто не хоча або няздольны ўзняцца да гэтага ўзроўню, будзе пакінуты ззаду. Літаратура паклікана не толькі для таго, каб ісці на ўзроўні патрабаванняў народа, але больш таго, — яна абавязана развіваць густы народа, узнімаць вышэй яго патрабаванні, узбагачаць яго новымі ідэямі, весці народ наперад. Той, хто няздольны ісці ў нагу з народам, задаволіць яго ўзросшыя патрабаванні, быць на ўзроўні задач развіцця совецкай культуры, немінуча выйдзе ў тыраж.

З недахопу ідэйнасці ў кіруючых работнікаў «Звезды» і «Ленинграда» вынікае і другая буйная памылка. Яна заключаецца ў тым, што некаторыя нашы кіруючыя работнікі паставілі ў аснову сваіх адносін з літаратарамі не інтарэсы палітычнага выхавання совецкіх людзей і палітычнага напрамку літаратараў, а інтарэсы асабістыя, прыяцельскія. Гавораць, што многія шкодныя ў ідэйных і слабыя ў мастацкіх адносінах творы дапускаюцца ў друк з прычыны нежадання пакрыўдзіць таго ці іншага пісьменніка. З пункту гледжання такіх работнікаў лепш пагрэбаваць інтарэсамі народа, інтарэсамі дзяржавы дзеля таго, каб каго-небудзь не пакрыўдзіць. Гэта зусім няправільная і палітычна памылковая ўстаноўка. Гэта—усёроўна, што абмяняць мільён на грош.

Цэнтральны Камітэт партыі ў сваім рашэнні ўказвае на найвялікшую шкоду падмены прынцыповых адносін у літаратуры адносінамі прыяцельскімі. Беспрынцыпныя прыяцельскія адносіны ў асяроддзі некаторых нашых літаратараў адыгралі глыбока адмоўную ролю, павялі да зніжэння ідэйнага ўзроўню многіх літаратурных твораў, зрабілі больш лёгкім пранікненне ў літаратуру чужым совецкай літаратуры людзям. Адсутнасць крытыкі з боку кіраўнікоў ідэалагічнага фронта ў Ленінградзе, з боку кіраўнікоў ленінградскіх часопісаў, падмена прынцыповых адносін прыяцельскімі адносінамі за кошт інтарэсаў народа прынеслі найвялікшую шкоду.

Таварыш Сталін вучыць нас, што, калі мы хочам захаваць кадры, вучыць і выхоўваць іх, мы не павінны баяцца пакрыўдзіць каго-небудзь, не павінны баяцца прынцыповай, смелай, шчырай і аб'ектыўнай крытыкі. Без крытыкі ўсялякая арганізацыя, у тым ліку і літаратурная, можа загніць. Без крытыкі ўсялякую хваробу можна загнаць углыб і з ёй цяжэй будзе справіцца. Толькі смелая і адкрытая крытыка дапамагае ўдасканальвацца нашым людзям, прымушае іх ісці наперад, пераадольваць недахопы сваёй работы. Там, дзе няма крытыкі, там укараняецца затхласць і застой, там няма месца руху наперад.

Таварыш Сталін неаднаразова ўказвае на тое, што важнейшай умовай нашага развіцця з'яўляецца неабходнасць таго, каб кожны совецкі чалавек падводзіў вынік сваёй работы за кожны дзень, без баязлівасці правяраў-бы сябе, аналізаваў сваю работу, мужна крытыкаваў свае недахопы і памылкі, абдумваў-бы, як дабіцца лепшых вынікаў сваёй работы і няспынна працаваў-бы над сваім удасканаленнем. Да літаратараў гэта адносіцца ў такой-жа меры, як і да ўсякіх іншых работнікаў. Той, хто баіцца крытыкі сваёй работы, той агідны баязлівец, не варты павагі з боку народа. **(Бурныя апладысменты).**

Некрытычныя адносіны да сваёй работы, падмена прынцыповых адносін да літаратараў прыяцельскімі шырока распаўсюджаны і ў Праўленні Саюза совецкіх пісьменнікаў. Праўленне Саюза і ў прыватнасці яго старшыня тав. Ціханаў вінаваты ў тых недахопах, якія ўскрыты ў часопісах «Звезда» і «Ленинград», вінаваты ў тым, што яны не толькі не паставілі перашкоды пранікненню ў совецкую літаратуру шкодных уплываў Зошчанкі, Ахматавай і іншых несовецкіх пісьменнікаў, але і патуралі пранікненню ў нашы часопісы чужых совецкай літаратуры тэндэнцый і нораваў.

У недахопах ленінградскіх часопісаў адыграла сваю ролю і тая сістэма безадказнасці, якая склалася ў кіраўніцтве часопісамі пры тым становішчы ў рэдакцыях ленінградскіх часопісаў, калі невядома хто адказваў за часопіс цалкам і за яго аддзелы, калі не магло быць элементарнага парадку. Гэты недахоп неабходна выправіць. Вось чаму Цэнтральны Камітэт сваёй пастановай прызначыў галоўнага рэдактара часопіса «Звезда», які павінен адказваць за напрамак часопіса, за высокія ідэйныя і мастацкія якасці твораў, якія змяшчаюцца ў часопісе.

У часопісах, як і ва ўсякай справе, нельга цярпець беспарадак і анархію. Патрэбна выразная адказнасць за напрамак часопіса і змест друкуемых матэрыялаў.

Вы павінны аднавіць слаўныя традыцыі ленінградскай літаратуры і ленінградскага ідэалагічнага фронта. Горка і крыўдна, што часопісы Ленінграда, якія заўсёды былі рассадлікамі перадавых ідэй, перадавой культуры, сталі прытулкам безыдэйнасці і пошласці. Трэба аднавіць чэсць Ленінграда, як перадавога ідэалагічнага і культурнага цэнтра. Трэба памятаць, што Ленінград быў калыскай большэвіцкіх ленінскіх арганізацый. Тут Ленін і Сталін заклалі асновы большэвіцкай партыі, асновы большэвіцкага светапогляду, большэвіцкай культуры.

Справа гонару ленінградскіх пісьменнікаў, ленінградскага партыйнага актыва заключаецца ў тым, каб аднавіць і развіць далей гэтыя слаўныя традыцыі Ленінграда. Задача работнікаў ідэалагічнага фронта ў Ленінградзе і ў першую чаргу пісьменнікаў заключаецца ў тым, каб выгнаць з ленінградскай літаратуры безыдэйнасць і пашляціну, каб высока ўзняць сцяг перадавой совецкай літаратуры, каб не ўпусціць ні адной магчымасці для свайго ідэйнага і мастацкага росту, не адстаць ад сучаснай тэматыкі, не адстаць ад патрабаванняў народа, усяляк развіваць смелую крытыку сваіх недахопаў, крытыку не падхалімскую, не групавую і прыяцельскую, а сапраўдную, смелую і незалежную, ідэйную большэвіцкую крытыку.

Таварышы, цяпер для вас павінна быць зразумела, які грубы промах быў дапушчаны Ленінградскім гарадскім камітэтам партыі, у асаблівасці яго аддзелам прапаганды і агітацыі і сакратаром па прапагандзе тав. Шырокавым, які быў пастаўлены на чале ідэалагічнай работы і на якога ў першую чаргу кладзецца адказнасць за правал часопісаў. Ленінградскі камітэт партыі дапусціў грубую палітычную памылку, прыняўшы ў канцы чэрвеня месяца рашэнне аб новым складзе рэдакцыі часопіса «Звезда», у які быў уведзены і Зошчанка. Толькі палітычнай слепатой можна растлумачыць, што сакратар гаркома партыі тав. Капусцін і сакратар гаркома па прапагандзе тав. Шырокаў правялі такое памылковае рашэнне. Паўтараю, што ўсе гэтыя памылкі трэба як мага хутчэй і рашуча выправіць з тым, каб аднавіць ролю Ленінграда ў ідэйным жыцці нашай партыі.

Усе мы любім Ленінград, усе мы любім нашу ленінградскую партыйную арганізацыю як адзін з перадавых атрадаў нашай партыі. У Ленінградзе і не павінна быць прытулку для розных літаратурных прайдзісветаў, якія прымазаліся, якія хочуць скарыстаць Ленінград у сваіх мэтах. Для Зошчанкі, Ахматавай і ім падобных Ленінград совецкі не дарагі. Яны хочуць бачыць у ім увасабленне іншых грамадска-палітычных парадкаў і іншай ідэалогіі. Стары Пецярбург, Медны коннік, як вобраз гэтага старога Пецярбурга, — вось што маячыць перад іх вачыма. А мы любім Ленінград совецкі, Ленінград, як перадавы цэнтр совецкай культуры. Слаўная когорта вялікіх рэволюцыйных і дэмакратычных дзеячоў, якія вышлі з Ленінграда, — гэта нашы прамыя продкі, ад якіх мы вядзем сваю радаслоўную. Слаўныя традыцыі сучаснага Ленінграда ёсць працяг развіцця гэтых вялікіх рэволюцыйных дэмакратычных традыцый, якія мы ні на што іншае не змяняем. Няхай ленінградскі актыў смела, без аглядкі назад, без «падрасорвання» прааналізуе свае памылкі, каб як мага лепш і хутчэй выправіць справу і рушыць нашу ідэйную работу наперад. Ленінградскія большэвікі павінны зноў заняць сваё месца ў радах застрэльшчыкаў і перадавікоў у справе фармавання совецкай ідэалогіі, совецкай грамадскай свядомасці. **(Бурныя апладысменты).**

Як магло здарыцца, што Ленінградскі гарком партыі дапусціў такое становішча на ідэалагічным фронце? Відавочна, ён захапіўся бягучай практычнай работай па аднаўленню горада, па ўздыму яго прамысловасці і забыўся аб значэнні ідэйна-выхаваўчай работы, і гэта забыццё дорага каштавала ленінградскай арганізацыі. Нельга забываць ідэйную работу! Духоўныя багацці нашых людзей не менш важны, чым матэрыяльныя. Нельга жыць нічога не бачачы, не клапоцячыся аб заўтрашнім дні не толькі ў галіне матэрыяльнай вытворчасці, але і ў галіне ідэалагічнай. Нашы совецкія людзі выраслі настолькі, што не будуць «глытаць» усякую духоўную прадукцыю, якую-б ім ні падсунулі. Работнікі культуры і мастацтва, якія не перабудуюцца і не змогуць задаволіць узросшых запатрабаванняў народа, могуць хутка страціць давер народа.

Таварышы, наша совецкая літаратура жыве і павінна жыць інтарэсамі народа, інтарэсамі радзімы. Літаратура—гэта родная для народа справа. Вось чаму кожны ваш поспех, кожны значны твор народ разглядае, як сваю перамогу. Вось чаму кожны ўдалы твор можна параўноўваць з выйгранай бітвай або з буйнай перамогай на гаспадарчым фронце. Наадварот, кожная няўдача ў совецкай літаратуры глыбока крыўдная і горкая для народа, партыі, дзяржавы. Іменна гэта мае на ўвазе пастанова ЦК, які клапоціцца аб інтарэсах народа, аб інтарэсах яго літаратуры і вельмі занепакоены становішчам справы ў ленінградскіх пісьменнікаў.

Калі безыдэйныя людзі хочуць пазбавіць ленінградскі атрад работнікаў совецкай літаратуры яго асновы, хочуць падарваць ідэйны бок іх работы, пазбавіць творчасць ленінградскіх пісьменнікаў яе грамадскага пераўтваральнага значэння, дык Цэнтральны Камітэт спадзяецца, што ленінградскія літаратары знойдуць у сабе сілы пакласці канец усім спробам увесці літаратурны атрад Ленінграда, яго часопісы ў рэчышча безыдэйнасці, беспрынцыпнасці, апалітычнасці. Вы пастаўлены на перадавую лінію фронта ідэалогіі, у вас велізарныя задачы, якія маюць міжнароднае значэнне, і гэта павінна ўзняць пачуццё адказнасці кожнага сапраўднага совецкага літаратара перад сваім народам, дзяржавай, партыяй, усведамленне важнасці выконваемага абавязку.

Буржуазнаму свету не падабаюцца нашы поспехі як унутры нашай краіны, так і на міжнароднай арэне. У выніку другой сусветнай вайны ўмацаваліся пазіцыі социялізма. Пытанне аб социялізме пастаўлена на парадку дня ў многіх краінах Еўропы. Гэта не падабаецца імперыялістам усіх масцей, яны баяцца социялізма, баяцца нашай социялістычнай краіны, якая з'яўляецца ўзорам для ўсяго перадавога чалавецтва. Імперыялісты, іх ідэйныя прыслужнікі, іх літаратары і журналісты, іх палітыкі і дыпламаты ўсяляк імкнуцца ўзвесці паклёп на нашу краіну, прадставіць яе ў няправільным святле, узвесці паклёп на социялізм. У гэтых умовах задача совецкай літаратуры заключаецца не толькі ў тым, каб адказваць ударам на ўдар супроць усяго гэтага агіднага паклёпу і нападкаў на нашу совецкую культуру, на социялізм, але і смела бічаваць і нападаць на буржуазную культуру, якая знаходзіцца ў стане маразма і разлажэння.

У якую-б знешне прыгожую форму ні была апранута творчасць модных сучасных буржуазных заходнееўрапейскіх і амерыканскіх літаратараў, а таксама кінорэжысёраў і тэатральных рэжысёраў, усёроўна ім не выратаваць і не ўзняць сваёй буржуазнай культуры, бо маральная аснова ў яе гнілая і разлагальная, бо гэта культура пастаўлена на службу прыватна-капіталістычнай уласнасці, на службу эгаістычным, карыслівым інтарэсам буржуазнай верхавіны грамадства. Уся безліч буржуазных літаратараў, кінорэжысёраў, тэатральных рэжысёраў імкнецца адцягнуць увагу перадавых пластоў грамадства ад вострых пытанняў палітычнай і социяльнай барацьбы і адвесці ўвагу ў рэчышча пошлай безыдэйнай літаратуры і мастацтва, напоўненых гангстэрамі, дзяўчатамі з вар'етэ, усхваленнем адзюльтэра і паходжанняў усякіх авантурыстаў і прайдзісветаў.

Ці да твару нам, прадстаўнікам перадавой совецкай культуры, совецкім патрыётам, схіляцца перад буржуазнай культурай або быць вучнямі яе?! Вядома, наша літаратура, якая адлюстроўвае лад больш высокі, чым усялякі буржуазна-дэмакратычны лад, культуру на многа разоў больш высокую, чым буржуазная культура, мае права на тое, каб вучыць другіх новай агульначалавечай маралі. Дзе вы знойдзеце такі народ і такую краіну, як у нас? Дзе вы знойдзеце такія выдатныя якасці людзей, якія праявіў наш совецкі народ у Вялікай Айчыннай вайне і якія ён кожны дзень праяўляе ў працоўных справах, перайшоўшы да мірнага развіцця і аднаўлення гаспадаркі і культуры! Кожны дзень узнімае наш народ усё вышэй і вышэй. Мы сёння не тыя, што былі ўчора, і заўтра будзем не тымі, што былі сёння. Мы ўжо не тыя рускія, якімі былі да 1917 года, і Русь у нас ужо не тая, і характар у нас не той. Мы змяніліся і выраслі разам з тымі найвялікшымі пераўтварэннямі, якія ў корані змянілі аблічча нашай краіны.

Паказаць гэтыя новыя высокія якасці совецкіх людзей, паказаць наш народ не толькі ў яго сённешні дзень, але і заглянуць у яго заўтрашні дзень, дапамагчы асвятліць пражэктарам шлях наперад—такая задача кожнага добрасумленнага совецкага пісьменніка. Пісьменнік не можа цягнуцца ў хвасце падзей, ён абавязаны ісці ў перадавых радах народа, указваючы народу шлях яго развіцця. Кіруючыся метадам социялістычнага рэалізма, добрасумленна і ўважліва вывучаючы нашу сапраўднасць, імкнучыся глыбей прасякнуць у сутнасць працэсаў нашага развіцця, пісьменнік павінен выхоўваць народ і ўзбройваць яго ідэйна. Выбіраючы лепшыя пачуцці і якасці совецкага чалавека, раскрываючы перад ім заўтрашні яго дзень, мы павінны паказаць у той-жа час нашым людзям, якімі яны не павінны быць, павінны бічаваць перажыткі ўчарашняга дня, перажыткі, якія перашкаджаюць совецкім людзям ісці наперад. Совецкія пісьменнікі павінны дапамагчы народу, дзяржаве, партыі выхаваць нашу моладзь бадзёрай, якая верыць у свае сілы, якая не баіцца ніякіх цяжкасцей.

Як-бы буржуазныя палітыкі і літаратары ні стараліся ўтоіць ад сваіх народаў праўду аб дасягненнях совецкага ладу, совецкай культуры, як-бы яны ні спрабавалі збудаваць жалезную заслону, за мяжой якой не магла-б пранікнуць за граніцу праўда аб Совецкім Саюзе, як-бы яны ні намагаліся прынізіць сапраўдны рост сіл совецкай культуры—усе гэтыя спробы асуджаны на правал. Мы вельмі ведаем сілу і перавагу нашай [illegible]. Досыць напомніць здзіўляючыя поспехі нашых культурных дэлегацый за [illegible] наш фізкультурны парад і г. д. [illegible] нізкапаклоннічаць перад усёй [illegible] шчынай або займаць пасіўную [illegible] пазіцыю!

Калі феадальны лад, а затым [illegible] ў перыяд свайго росквіту ма[illegible] мастацтва і літаратуру, якія [illegible] станаўленне новага ладу і [illegible] росквіт, то нам, ладу новаму, [illegible] наму, які прадстаўляе з сябе [illegible] ўсяго, што ёсць лепшага ў [illegible] вечай цывілізацыі і культуры, [illegible] па плячу стварэнне самай пе[illegible] це літаратуры, якая пакіне [illegible] самыя лепшыя ўзоры творч[illegible] часоў.

Таварышы, чаго патрабуе і хоча Цэнтральны Камітэт? Цэнтральны Камітэт партыі хоча, каб ленінградскі актыў і ленінградскія пісьменнікі добра зразумелі, што надышоў час, калі неабходна ўзняць на высокі ўзровень нашу ідэйную работу. Маладому совецкаму пакаленню прадстаіць умацаваць сілу і магутнасць социялістычнага совецкага ладу, поўнасцю скарыстаць рухаючыя сілы совецкага грамадства для новага нябачанага росквіту нашага добрабыту і культуры. Для гэтых вялікіх задач маладое пакаленне павінна быць выхавана стойкім, бадзёрым, якое не баіцца перашкод, ідзе насустрач гэтым перашкодам і ўмее іх пераадольваць. Нашы людзі павінны быць адукаванымі, высока-ідэйнымі людзьмі, з высокімі культурнымі, маральнымі патрабаваннямі і густамі. Для гэтай мэты нам трэба, каб літаратура наша, часопісы нашы не стаялі ў баку ад задач сучаснасці, а дапамагалі-б партыі і народу выхоўваць моладзь у духу самаахвярнай адданасці совецкаму ладу, у духу самаахвярнага служэння інтарэсам народа.

Совецкія пісьменнікі і ўсе нашы ідэалагічныя работнікі пастаўлены цяпер на перадавую лінію агню, бо ва ўмовах мірнага развіцця не знімаюцца, а, наадварот, узрастаюць задачы ідэалагічнага фронта і ў першую чаргу літаратуры. Народ, дзяржава, партыя хочуць не аддалення літаратуры ад сучаснасці, а актыўнага ўтаржэння літаратуры ва ўсе бакі совецкага быцця. Большэвікі высока цэняць літаратуру, выразна бачаць яе вялікую гістарычную місію і ролю ва ўмацаванні маральнага і палітычнага адзінства народа, у згуртаванні і выхаванні народа. Цэнтральны Камітэт партыі хоча, каб у нас было багацце духоўнай культуры, бо ў гэтым багацці культуры ён бачыць адну з галоўных задач социялізма.

Цэнтральны Камітэт партыі ўпэўнены, што ленінградскі атрад совецкай літаратуры, маральна і палітычна здаровы, хутка выправіць свае памылкі і зойме належнае месца ў радах совецкай літаратуры.

ЦК упэўнены, што недахопы ў работе ленінградскіх пісьменнікаў будуць пе[illegible] адолены і што ідэйная работа ленінгра[illegible] скай партыйнай арганізацыі ў самы на[illegible] карацейшы тэрмін будзе ўзнята на так[illegible] вышыню, якая патрэбна цяпер у інтарэ[illegible] партыі, народа, дзяржавы. **(Бурныя [illegible] дысменты. Усе ўстаюць).**

ЛІКВІДАВАЦЬ НЕДАХОПЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ КІНЕМАТАГРАФІІ

(На аб'яднаным адкрытым партыйным сходзе Міністэрства кінематаграфіі БССР і кіностудыі „Совецкая Беларусь")

Творчыя работнікі кінематаграфіі БССР у другі раз сабраліся, каб абмеркаваць пастанову ЦК ВКП(б) «Аб кінофільме «Большая жизнь». Але і на гэты раз сход быў не падрыхтаваны і выступаўшыя больш займаліся размовамі аб адміністрацыйным бязладдзі, адцягваючы ўвагу ад асноўнага—ад ідэйна-мастацкай якасці кінопрадукцыі і тых недахопаў, якія маюць месца ў творчай рабоце кіно-студыі. Дакладчык У. Корш-Саблін (мастацкі кіраўнік кіно-студыі «Совецкая Беларусь»), спасылаючыся на тое, што ўсе ведаюць пастанову ЦК ВКП(б), не прывёў палажэнні гэтай пастановы, якія ўскрываюць прычыны памылак не толькі калектыва, што працаваў над фільмам «Большая жизнь», але і ўсёй нашай совецкай кінематаграфіі. «...Некаторыя работнікі мастацтва,—гаворыцца ў пастанове,—жывучы сярод совецкіх людзей, не заўважылі іх высокіх ідэйных і маральных якасцей, не змаглі па-сапраўднаму адлюстраваць іх у творах мастацтва». І далей: «Справа ў тым, што шмат якія майстры кінематаграфіі, пастаноўшчыкі, рэжысёры, аўтары сцэнарыяў лёгкадумна і безадказна ставяцца да сваіх абавязкаў, не добрасумленна працуюць над стварэннем кіно-фільмаў. Галоўны недахоп у іх рабоце заключаецца ў тым, што яны не вывучаюць справу, за якую бяруцца». Дакладчык не сказаў аб гэтым, а ўказаў толькі на ідэйнае адставанне некаторых кінаработнікаў БССР. У той час, як прыклады, аб якіх гаварыў У. Корш-Саблін, ілюструюць вышэй прыведзеныя думкі.

Сцэнарый Я. Памешчыкава «Новы дом» (які называўся ў першай рэдакцыі «Іван ды Мар'я») напісаны без ведання беларускай рэчаіснасці. Апроч таго, інтэлігенцыя (пісьменнік і дзяўчына-кампазітар) невядома чаму паказваюцца адмоўнымі героямі. Таксама адмоўныя рысы ёсць і ў такіх станоўчых вобразах — кіраўнікоў калгасаў, як Вяшняк і Палойка.

Гэтыя недахопы сцэнарыя «Новы дом» і паглыблены яшчэ больш, калі над ім [illegible] і працаваць пастаноўшчык і акторы.

[illegible]ош-Саблін, які з'яўляецца пастаноў[illegible] фільма «Новы дом», апраўдвае гэ[illegible]энні тым, што ён вырашаў тэму [illegible] калгаса ў жанры музычнай ка[illegible]ва, вядома, не ў жанры, а ў сут[illegible]іэння тэмы, у характары пады[illegible]. Тады, калі пачыналі ставіць [illegible]зята была ўстаноўка на ства[illegible]ляльнага кіно-фільма, у выніку [illegible]ўся твор, які няправільна адлю[illegible]рацэс аднаўлення беларускага [illegible]эта здарылася таму, што нека[illegible], работнікі паддаліся настроям [illegible] і забыліся аб напружанай адна[illegible]енчай працы, якая пачалася ва ўсіх кутках Беларускай ССР.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі.

Кіноаператары І. Вейняровіч і У. Цяслюк гаварылі аб тым, што кадры, якія былі паказаны ўдзельнікам схода, скажона адлюстроўваюць нашу рэчаіснасць, прыбядняюць [illegible]. Гэтымі-ж таварышамі крытыкавалася работа і кіно-хроніка. Хроніка працуе бясплана, здымаюцца выпадковыя сюжэты, а дырэкцыя ў пагоні за хутчэйшым выпускам часопіса ці нарыса на экран прымушае аператараў даваць недаапрацаваныя кадры. Наогул, кіраўніцтва студыі і ў прыватнасці З. Іцкоў, як дырэктар кіно-студыі, не заўсёды патрабавальна ставіцца да работы аператара. Часта на адказныя здымкі пасылаюцца малакваліфікаваныя аператары, з прычыны чаго зазняты матэрыял бывае нядобраякасным (аператары Мартынаў і Камароў). Нашы часопісы не маюць свайго твару. Кінаработнікі не ведаюць жыцця і не вывучаюць яго глыбока. Нарыс аб калгасе-мільянеры «Рассвет» доўгі час ляжыць не закончаным. Ужо заснята больш 500 метраў плёнкі, але выразнае ўяўленне аб фільме адсутнічае нават у саміх пастаноўшчыкаў.

Рэжысёр Г. Любошыц недахопы работы кіно-студыі бачыць у адсутнасці ідэйна-выхаваўчай работы сярод творчых работнікаў, а таксама ў тым, што сцэнарыі папярэдне не абмяркоўваюцца. У кіно-студыі адсутнічае большэвіцкая крытыка і самакрытыка.

— У выніку таго, што ў асяроддзі кінаработнікаў,— гаворыць галоўны рэдактар студыі тав. Гарбуноў,—бытуе яшчэ няправільная тэорыя аб праве творчых работнікаў на памылкі, у нас выпускаецца шмат браку. Так, у часопісу № 15—16 і тэкст (П. Кавалёва) і здымкі (І. Вейняровіча) надзвычай павярхоўна адлюстроўваецца вытворчы размах новай пяцігодкі.

Апрача прызнання, што кіраўніцтва кіностудыі не справілася са сваёй работай, выступаўшы З. Іцкоў нічога не сказаў аб тым, як мяркуе кіно-студыя перабудаваць сваю работу ў адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) «Аб кіно-фільме «Большая жизнь».

— Таварышы, якія выступалі на сходзе,—гаворыць прадстаўнік аддзела кадраў ЦК ВКП(б) тав. Горцаў,—не раскрылі і не паказалі, якія вывады неабходна зрабіць з пастановы ЦК ВКП(б) аб кіно-фільме «Большая жизнь». Гаварылі аб нізкай якасці кінопрадукцыі, але не ўскрылі прычын, якія параджаюць гэта. Недахопы фільма «Новы дом», асобных нарысаў і кіно-часопісаў залежаць ад таго, што творчыя работнікі даволі безадказна ставяцца да сваёй працы, яны не вывучаюць жыццё і тым самым недаацэньваюць значэння такога масавага мастацтва, як кіно.

Мала змястоўным было выступленне загадчыка сцэнарнага аддзела кіно-студыі М. Блісцінава. Ён чамусьці выступіў як абаронца бяздзейнага кіраўніцтва студыі, шмат гаварыў аб гаспадарчых справах.

У канцы схода выступіў міністр кінематаграфіі БССР М. Садковіч. Ён адзначыў, што партарганізацыя кіно-студыі не зразумела значэння пастановы ЦК ВКП(б)—адзінаправільнай праграмы, па якой трэба працаваць і для выканання якой неабходна мабілізаваць усе свае сілы.

Сход паказаў, што пастанова ЦК ВКП(б) «Аб кіно-фільме «Большая жизнь» і да гэтага часу не знайшла свайго практычнага ажыццяўлення ў працы работнікаў кінамастацтва БССР.

Выгляд адноўленых фантанаў у Петрадварцы.
Фота С. Крапіўніцкага і Н. Караваева. (Фотахроніка ТАСС).

К. КІРЭЕНКА.

КОЛАС

Коласу—вырасціць жменю зярнят.
М. ТАНК.

Вясной, толькі сонца сагрэла зямлю—
Кінуў калгаснік зерне ў раллю.

Поле з ласкай, як шчырая матка,
Коўдраю цёплай
Пакрыла зярнятка.
Потам, што па расінцы збірала,—
Карміла,—
Сокам, што з глыбіні даставала,—
Паіла.
На свет, пад дажджы
Падымала ўлюбёна...

І зерне коласам стала зялёным.

Колькі дзён летніх, ясных, прыгожых,
Колас важна гайдаўся над Сожам,

Цешыўся громам, росамі, воляй,
Песнямі, што не сціхалі у полі.

Доўга сонца гарачае
З высі
Песціла колас,
Каб добра наліўся,

Покуль прыгнуўся з пакораю долу
Буйны, чакаючы жнеяў вясёлых.

Сціх урачыста ў той міг далягляд!...
Вырасціў колас жменю зярнят.

Зноў-жа калгаснік, што веснаю колісь
Потам паліў неагляднае поле,

Зерні правёў у дарогу і ветлым
Словам напутным даў запавет ім.

Што ён сказаў ім, куды іх паслаў ён?
Многа шляхоў у вялікай дзяржаве!

Мо', да дзяцей, што бацькоў не счакалі,
Змалку пад бомбамі горач пазналі,

Можа да тых, хто ад цёмна да цёмна
Мужна стаіць ля палаючых домнаў,

Ці хто палацы нанова будуе,
Ці хто ў дазоры днюе, начуе...

Едуць зярняты краем бацькоўскім,
Едуць з наказам роднае вёскі.

Кожнаму многае ў далях відно...
Прышло на руіны зерне адно.

Над чорнаю цэглай, над дзеяй суровай
Успомніла зерне напутнае слова,

Якое калгаснік сказаў пры растанні...
І ў сэрцы ўвайшло яно тым, хто з світання

Рабочай упартай рукою мазольнай
Капаў на развалінах новыя рольні,

Каб зноў вера ясная ўсіх акрыліла:
Быць гораду гэткім—як хоча край мілы.

А потым трывалаю стала цаглінай,
І новым падмуркам лягло ля руінаў.

Пад здатнай рукой, што зламала ўсе церні,
Штодзень расло вышай калгаснае зерне.

Паклаў сваёй сілы рабочы нямала...
І вось—
Зерне домам цудоўным устала.

Відно яму ўсё: ці дарогі, ці далі.
І сталінскай школаю дом той назвалі.

Шле горад падзяку ад імя краіны
У вёску, і ўжо селянін свайго сына

Праводзіць у горад вучыцца і кажа:
— Хай зерне навукі ў душу табе ляжа,

Як роднае наша; хай так прарастае,
Каб славы прыдбаў ты совецкаму краю.

Шляхамі другімі, з імкненнем адзіным
Астатнія зерні прайшлі ўсю краіну.

Адно з іх спынілася ў шахце, ў забоі,
На рэйдзе далёкім паўночным—другое;

Змагалася трэцяе за перамогу
На грозных, упартых дняпроўскіх парогах;

Чацвертае—стрэлі заводы Урала...
А самае буйнае—песняю стала.

Праросшы праз словы ў сэрцах мільёнаў,
Прышла тая песня да родных загонаў,

І радасным рэхам апала на поле,
Дзе столькі прастору, дзе столькі
прыволля,

Дзе глебу ўзбівае калгасны араты,
Каб вырасціў колас для шчасця зярняты...

1946 г.

ЛЕКТОРЫЙ ДЛЯ РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВА

Мінскі дом партыйнай асветы арганізаваў лекторый для работнікаў мастацтва. Намеснік загадчыка аддзела агітацыі і прапаганды ЦК КП(б)Б П. Саевіч прачытаў ужо работнікам мастацтва лекцыю аб абгрунтаванні і развіцці таварышам І. В. Сталіным тактычных асноў большэвіцкай партыі. У плане работы лекторыя яшчэ пяць лекцый па творах таварыша Сталіна і тры лекцыі аб пяцігадовым плане: «Беларусь у 4-й пяцігодцы», «Культура і навука ў 4-й пяцігодцы» і «Пераход ад соцыялізма да комунізма». Будуць прачытаны таксама некалькі лекцый аб міжнародным становішчы і цыкл лекцый па пытаннях літаратуры і мастацтва.

ЗА ЦЕСНУЮ СУВЯЗЬ З ЖЫЦЦЁМ

(На адкрытым партыйным сходзе ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР)

На чарговым адкрытым партыйным сходзе ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР былі абмяркованы матэрыялы 8-ай сесіі Вярхоўнага Совета БССР. З дакладам аб пяцігодцы аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1946—1950 г. г. выступіў П. Пестрак.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. Першым выступіў сакратар партыйнай арганізацыі І. Гурскі.

— Чацверты пяцігадовы план зменіць эканоміку і культуру нашай рэспублікі. У Беларусі з'явяцца свае трактары, аўтамабілі, веласіпеды, якія будуць вырабляцца на мінскіх заводах. Значна вырасце колькасць рабочых. Усё гэта павінна знайсці адлюстраванне ў літаратуры. Совецкі пісьменнік—як інжынер чалавечых душ—павінен змагацца ў першых радах за аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі і культуры сваёй рэспублікі.

— У велічных абрысах, — гаворыць П. Панчанка,—паўстае з новага пяцігадовага плана наша краіна. Чацвертая Сталінская пяцігодка пачалася ўжо. Тысячы беларускіх юнакоў і дзяўчат паехалі вучыцца на заводы Масквы, Ленінграда, Сталінграда і Урала, адкуль вернуцца да нас спецыялістамі. І вось аб гэтым новым пакаленні рабочых мы павінны пісаць. Пісьменнікі мусяць яшчэ больш наблізіцца да народа. Заўсёды, калі сустракаешся з людзьмі, дык з'яўляюцца свежыя і арыгінальныя думкі. А гэта асноўнае. Гэтым і каштоўны творы, напісаныя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, бо тады пісьменнік жыў разам са сваім героем і дасканала ведаў яго пачуцці і думкі.

— Мне хочацца сказаць, — гаворыць Ц. Крысько,—пра першыя крокі, якія зроблены нашымі пісьменнікамі ў галіне стварэння вершаў, паэм і аповесцей на аднаўленчую тэму. Побач з добрымі поўнацэннымі творамі тут сустракаюцца творы, у якіх адчуваецца літаратуршчына. Гэта асабліва датычыцца творчасці маладых і пачынаючых пісьменнікаў.

П. Кавалёў акцэнтуе ўвагу прысутных на тым, што літаратары абавязаны дапамагчы нашай партыі ў справе прапаганды пяцігодкі сярод мас.

— Мы павінны прапагандаваць не толькі лічбы пяцігодкі,—гаворыць К. Крапіва — але, у першую чаргу, вялікую мэту пяцігадовага плана. Мэта наша—комунізм, пры якім, як вядома, будзе ажыццёўлены прынцып ад кожнага па здольнасцях, кожнаму па патрэбнасцях. Гэта значыць, што чалавек павінен поўнасцю выкарыстаць свае здольнасці і не браць у грамадства болей, чым яму патрэбна. У стаханаўскім руху мы ўжо бачым зародкі комунізма. Задача літаратараў і заключаецца ў тым, каб выхоўваць на ўсіх совецкіх людзях гэтыя якасці, якасці перадавых людзей нашага грамадства.

У абмеркаванні прынялі ўдзел таксама М. Клімковіч і М. Танк.

АДКРЫЦЦЁ СІМФАНІЧНАГА СЕЗОНА

Беларуская Дзяржаўная Філармонія адкрыла сімфанічны сезон 1946-47 года.

У праграме канцэрта, які адбыўся 21 верасня 1946 г., была першая сімфонія беларускага кампазітара П. Падкавырава і творы выдатнага рускага кампазітара П. Чайкоўскага—заключная сцэна з оперы «Яўгені Анегін» і увертюра фантазіі «Рамэо і Джульета».

Першая сімфонія Падкавырава, якой адкрыўся канцэрт, прысвечана гераічнаму комсамолу, актыўнаму ўдзельніку Вялікай Айчыннай вайны. У ёй кампазітар імкнуўся ўвасобіць вобразы лепшых сыноў ленінска-сталінскага комсамола, што змагаліся за свабоду і незалежнасць нашай радзімы.

Хвалюючая ідэя, пакладзеная ў аснову сімфоніі, блізкая не толькі нашаму маладому пакаленню, якому яна прысвечана, але і ўсім слухачам. Таму неабходна падрабязна спыніцца на разглядзе гэтай сімфоніі з боку яе формы і развіцця музычнага матэрыяла.

Першая сімфонія Падкавырава напісана ў класічнай чатырохчастковай форме, пачынаецца з невялікага павольнага ўступу меднай групы (валторн, труб, трамбонаў). Увесь уступ заснаваны на характэрным, затактавым рытмічным рысунку, што застаецца ў памяці і пазнаецца ў кожнай частцы сімфоніі. Гэта рысунак з характэрнай гарманічнай афарбоўкай (рад атанальных акордаў) прасякае ўсе часткі сімфоніі. Але ці з'яўляецца гэтая музычная ячэйка сапраўды асноўнай тэмай мужнасці, калі яна не атрымоўвае развіцця ні ў адной з частак, а праходзіць як напамінак аб нечым, наогул неарганічным для сімфоніі. Калі гэта—лейтматыў гераічнага вобраза, дык вобраз гэты — бязвольны, чэзлы, які не змагаецца. Гэта далёка ад сучаснага героя.

Першая частка сімфоніі пачынаецца перарывістай меладычнай лініяй. Трывожнасць гэтага руху галоўнай партыі кантрастуецца пабочнай, больш шырокай па дыханню. Кантраст двух тэм—аснова класічнай санатнай формы, якая атрымала сваё завяршэнне ў творчасці Бетховена. Але ў сімфоніі Падкавырава няма сапраўднай, дынамічнай «бетховенскай» барацьбы гэтых двух тэм у распрацоўцы, г. зн. у той частцы санаты, якая з'яўляецца цэнтральнай па сваёй дынаміцы. Але аднаго супастаўлення галоўнай і даданай тэмы і ўкараненне ў рэпрызу тэмы ўступу зусім не дастаткова для паказу барацьбы двух пачаткаў.

Другая частка сімфоніі, павольная і пранікнёная — адна з лепшых частак усёй сімфоніі па задуме і ўвасабленню гэтай задумы. Гэта нібы-та невялікі адпачынак пасля першай часткі і падрыхтоўка да падзей, якія павінны адбыцца далей.

Трэцяя частка, напісаная ў характары вальса, адрозніваецца лёгкасцю аркестровых фарбаў і каларытнасцю, якія перарываюцца грозным тэмай уступу.

Фінал—некампактная, няцэласная частка. У ім—рад танцавальных рытмаў, хваляпадобныя рухі, у якіх адсутнічае сапраўдны драматызм гучання ўсяго аркестра. Усё гэта заключае ўрачысты марш на матэрыяле галоўнай партыі першай часткі сімфоніі, які павінен з'явіцца адказам на пытанне: «Як пражыць жыццё?»

Ідэя зместу гэтага твору — сучасная, хвалюючая наш народ, і класічная форма сімфоніі давала кампазітару ўсе магчымасці для поўнага ўвасаблення і развіцця гэтай ідэі.

Але тут перш за ўсё ўзнікае пытанне, ці можна першую сімфонію Падкавырава назваць сімфоніяй? Пытанне зусім слушнае таму, што ў сімфоніі адсутнічае дыялектычная процілегласць двух пачаткаў у першай частцы. А самае галоўнае—гэта адсутнасць такога важнага для абраўнай формы фактара, як сімфанічны метад мыслення і развіцця тэматычнага матэрыялу. У лібрэта сказана, што ў сімфоніі падзеі ўвасабляюцца ў музычныя вобразы. Які вобраз ёсць у гэтай сімфоніі? У ёй ёсць рад дробных, адасобленых тэм-вобразаў у кожнай з частак, вельмі слабых па характару, якія не атрымоўваюць сапраўднага развіцця, не паказаны ў поўнай сіле, нерэальныя таму, што ў сімфоніі не распрацавана асноўная тэма—тытанічнага. Гэтыя вобразы не могуць быць носьбітамі вялікіх ідэй, пакладзеных у аснову твору. Галоўная ідэя павінна перамагаць у фінале. Яе перамога выяўлена тут у маршы, які зусім непадрыхтаваны усім папярэднім развіццём музычнага матэрыялу—ні першых частак, ні апошняй часткі сімфоніі.

Усе чатыры часткі сімфоніі не маюць адзінай дынамічнай лініі развіцця, не звязаны лагічна між сабой.

Музычная мова сімфоніі зламаная, рытчурная. Так, напрыклад, першая і другая часткі сімфоніі заканчваюцца дысанансамі, нічым не апраўданымі. Гэтая мова, што з'яўляецца, на нашу думку, простай пагоняй за знешнімі раздражненнямі тэмбравага парадку і штукарствам падмяняе імкненне да выяўлення чыстых пачуццяў і глыбокіх думак, — супярэчыць рэалістычнай прыродзе совецкай музыкі.

Трэба сказаць некалькі слоў і аб выкананні ў канцэрце твораў Чайкоўскага. У заключнай сцэне оперы «Яўгені Анегін» добра праявілі сябе салісты — заслужаны артыст Армянскай ССР Сердобаў (Анегін) і артыстка Ц. Мільчына (Тацяна), якія пераканаўча перадалі інтымны душэўны свет, сілу пачуццяў герояў оперы.

Не можа задаволіць у канцэрце сімфанічны аркестр. Тая фальш, якая панавала ў аркестры (асобныя групы аркестра не строілі амаль на поўтона паміж сабой: драўляныя інструменты і арфа, медзь і струнныя). Дырыжор Т. Каламійцава ў дадзеным выпадку бачыла перад сабой толькі аркестр і, такім чынам, не аркестр следаваў за салістамі, а салісты за аркестрам.

Увертюра-фантазіі Чайкоўскага «Рамэо і Джульета» была выканана вельмі дрэнна. Дастаткова сказаць, што час выканання быў скарочаны на пяць хвілін.

Відаць, што сімфанічны аркестр не мае добрага кіраўніка. У аркестры не адчувалася імкнення да сапраўды мастацкага выканання, што ў значнай ступені абумовіла якасць канцэрта.

К. АКСІНІЧ.

НА ТЫМ-ЖА МЕСЦЫ

Сёмы нумар «Беларусі» адкрываецца перадавым артыкулам часопіса «Большевік» «Значэнне ідэалагічнай работы ў сучасных умовах». Нумар выйшаў пасля гістарычных пастаноў ЦК ВКП(б) аб ленінградскіх часопісах. Нарэшце, яшчэ задоўга да выхаду ў свет сёмага нумару «Беларусі» ў газеце «Культура і жыццё» быў надрукаваны крытычны артыкул аб часопісу «Беларусь», на які рэдакцыя адказала поўным прызнаннем сваіх недахопаў і абяцала выправіць іх. Здавалася, што ўсё гэта разам узятае павінна было прымусіць рэдакцыю перагледзець свае пазіцыі ў ацэнцы тых матэрыялаў, якія яна візіруе да друку.

Але, мяркуючы па гэтаму нумару, трэба сказаць, што рэдакцыя пакуль не зрабіла для сябе сур'ёзных вывадаў з усяго вышэйадзначанага.

Гэта можна з упэўненасцю сказаць, прачытаўшы матэрыялы як на палітычна-грамадскія тэмы, так і літаратурныя творы. Нумар, між іншым, вызначаецца перавагай літаратурных твораў. У гэтым не было-б ніякай заганы, калі-б яны па меншай меры мелі права прэтэндаваць на абнародванне.

Часопіс «Беларусь» даволі часта змяшчае на сваіх старонках пераклады твораў ленінградскіх паэтаў і пісьменнікаў. Да гэтай патрэбнай і карыснай справы рэдакцыя падыходзіць не заўсёды сур'ёзна. У сёмым нумары, напрыклад, надрукаваны верш «Стары Іркуцк» — ленінградскага паэта Саянава. У невялічкім вершы паэт дае абрыс старога купецкага Іркуцка.

«Ен важкі стаў, ён стаў багаты, слынны,
Раслі яго багацці кожны міг
Ад скарбаў залатых і сакаліных,
Ад кірмашоў і ад быстрынь рачных».

Каму цяпер патрэбна ідэалізацыя старога купецка-шынкарскага Іркуцка?

Не зусім удалым быў выбар вершаў з творчасці і другіх ленінградскіх паэтаў, надрукаваных у гэтым нумары.

Выклікаюць здзіўленне і вершы Пімена Панчанкі. Паэт глыбокай задушэўнай шчырасці нечакана пачаў гаварыць аб нечым маленькім і неўласцівым яго думам і пачуццям.

Вось ён ходзіць па парку ля Свіслачы і бязмэтна натуе розныя абразкі:

«А у Свіслачы вербы старанна мылі
На тоўстых нагах вузлаватыя пальцы.
На вербах чорныя птушкі вілі
Нешта накшталт палацаў».

Але на кары дрэва паэт заўважыў загадкавы надпіс «Аня», і яму зрабілася сумна «ад гэтага знаку кахання». Раптам паэта ўразіла, што недзе ў глыбіні парка

«Мёртвы Шаляпін спяваў, як жывы,
«Уніз да па матухне Волзе».

Паэт шукае мудрасці ў лістах і каменнях, да якіх погляды людзей «прыліпалі чякамі». «Ім трэба быць мудрымі, гэтым прадметам: Глядзець і слухаць сотні гадоў»...

Вось і ўся, уласна кажучы, філасофія гэтага твору — набор вобразаў, дробныя выпадковыя настроі. Такія-ж настроі пераважаюць і ў другім вершы П. Панчанкі. Паэт скардзіцца чытачу:

«Я тэмы для вершаў старанна вышукваў,
Пра шчасце людское я хітра выпытваў...
Але... і раптам вось гэта аднекуль нахлынула
Такая туга, такая самоцішча...
...Такая туга, што не знойдзеш і месца.
Ну, хоць-бы адна да васёласці кладачка!
Нібыта сядзіш адзінокі на месяцы
І слухаеш нудную мудрасць дакладчыка»...

Наўрад ці паспачувае чытач аўтару ў яго тузе, якая з'явілася ў паэта проста так-сабе, без дай прычыны. Яна лёгка прыйшла і яшчэ лягчэй патанула ў вачах дзяўчыны.

«Са мною ты побач. Сусвет заспакоены,
І зноўку так добра, так шчыра навокал».

Як мала, аказваецца, трэба для таго, каб радасць перайшла ў тугу, а туга — ў радасць. І як гэта мізэрна нават для лірычнага вершу! Пачуцці, якія так лёгка змяняюць адно другое — неглыбокія, выпадковыя пачуцці, якія менш за ўсё павінны былі-б хваляваць сёння паэта. І складаецца ўражанне, што П. Панчанка проста забаўляецца імі, вокамгненна падмяняючы іх адно другім.

З іншых паэтычных твораў, надрукаваных у сёмым нумары часопіса, варта адзначыць, як больш удалыя, вершы М. Танка, «Уступ»—К. Кірэенкі.

А. Бялевіча,—аўтара ўрыўка з паэмы «Сям'я»,—не без падставы можна папракнуць у залішняй «лёгкасці» паказу пасляваеннага жыцця калгаснай сям'і.

Паэта варта і трэба сур'ёзна папракнуць яшчэ і ў неахайнасці мовы і стылю, якую можна заўважыць у надрукаваным урыўку. Чаго варты такія, напрыклад, радкі:

«Вугал ціхі каханнем сагрэт,
Расцвілі ад кахання вазоны»(?)

Або:

«Пакацілася кадзя дваром,
Зазвінела яна, як званіца».

Варта было-б ведаць, што звоніць звон, а не званіца.

Ці:

Водзіць левай рукой Апанас
Руку сына малога Якуба:
Ен імя сваё піша: «Тарас» (?!)

Якое ўсё-такі імя сына: Якуб ці Тарас? Падобныя прыклады можна было-б павялічыць. Адзначаючы іх, іншы раз цяжка зразумець: дзе канчаецца неахайнасць і пачынаецца звычайная непісьменнасць.

Паэма В. Таўлая «Таварыш» не стаіць яшчэ на ўзроўні высокага мастацкага абагульнення тэмы. Паэма больш нагадвае паэтычны чарнавы запіс успамінаў, падзей, жанравых сцэнак польскай турмы, што ў канчатковым варыянце павінна было набыць сюжэтную і кампазіцыйную стройнасць, яснасць і мэтанакіраванасць галоўнага вобраза.

З празаічных твораў спрэчным на сваёй мастацкай вартасці з'яўляецца апавяданне У. Краўчанкі «Чэрвень». Што дасць чытачу саладжавая гісторыя двух закаханых, у ліку якіх быў і сам аўтар? Ды нічога. Двое маладых людзей паплылі па Дняпры на лодцы ў суседнюю вёску, каб адзін з іх сустрэўся там са сваёй дзяўчынай, а другі спазніўся спаткаць сваю дзяўчыну. Тыповае «дачнае» апавяданне з дарэвалюцыйнага «Живописного обозрения».

Невядома, чым кіравалася рэдакцыя, друкуючы апавяданне «Сад» — А. Кулакоўскага, Мала таго, што яно наогул слабае, як мастацкі твор, у ім няправільна яшчэ паказваецца аблічча пасляваеннага калгаса. Калі верыць аўтару, дык нямецкая акупацыя знішчыла ў нашых сялян ідэю калгаснага супрацоўніцтва. Загадчык фермы спадзяецца, што калгаснікі не жадаюць камплектаваць ферму за лік кантрактацыі маладняка. Кожнае цяля рэжуць, каб толькі не здаць на калгасную ферму... Селянін Тохвіль крадзе калгаснага каня і трымае яго ў сябе, пакуль пакража не выкрываецца. Калгасам фактычна кіруе рахункавод Ігнат Сеўрук, які таксама крадзе калгасную малатарню.

І, бадай, адзін калгасны садавод Несцер — былы франтавік, застаўся на вышыні соцыялістычнай свядомасці. І толькі таму, напрашваецца такі вывад з апавядання, што ён быў на фронце і гэтым самым пазбег уплыву нямецкай акупацыі. Шкоднае супроцьстаўленне людзей, якія былі пад акупацыяй, людзям, якія пазбеглі яе,—скажаюць жыццёвую праўду. Апавяданне «Сад» стаіць далёка ад сапраўднасці.

У гэтым нумары рэдакцыя зрабіла спробу выправіць свой істотны недахоп у асвятленні роста пасляваеннай буйнай прамысловасці БССР, надрукаваўшы нарыс Я. Садоўскага «Беларускі аўтамабіль». Але як далёка ўсё-такі гэта карэспандэнцыя ад сапраўднага мастацкага нарысу! Абстрактны пафас, перамешаны з сухой газетнай інфармацыяй. Звычайныя простыя людзі размаўляюць у Я. Садоўскага таннымі штампаванымі тырадамі:

— Вось яна наша новая Беларусь... У будаўнічых рыштаваннях уздымаецца яна з руін і папялішча і будзе яшчэ больш прыгажэйшай, чым была... — каментыруе падарожжа аўтара па тэрыторыі аўтазавода будаўнік Іван Бяссмертны. — Вы-ж самі ведаеце, што пісалі аб нашай зямлі. Край балот, чарот(?) жураўлёў...» І гэтак далей і ўсё ў такім-жа «высокім» стылю, у якім можна пісаць не бачачы ні новабудоўлі, ні Івана Бяссмертнага.

У часопісу надрукавана некалькі цікавых па зместу матэрыялаў, як напрыклад, нарыс М. Судніка аб выдатным этнографе Насовічу, артыкул Ф. Фёдарава «Атамнае ядро і яго энергія» і інш. Але пераважаюць матэрыялы недаапрацаваныя, лёгкадумныя, а часам і непатрэбныя.

Усё гэта дае падставу меркаваць, што рэдакцыя «Беларусі» яшчэ вельмі марудна перабудоўвае сваю работу паводле ўказанняў ЦК ВКП(б), не зрабіла належных вывадаў з той справядлівай крытыкі, якая была накіравана па яе адрасу.

С. М.

Рэдкалегія: Л. Александроўская, А. Багатыроў, Г. Глеб[illegible] П. Кавалёў, Якуб Колас, А. Куляшоў, А. К[illegible] (в. а. адказнага рэдактара), П. Пестрак, Г. Тар[illegible]

[illegible]30277 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Рэвалюцыйная 3 Друкарня «Чырвоны Друкар», Рэвалюцыйная, 12.